ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЇН ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך! ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! PROLETARJUSZE WSZYSTKICH KRAJÓW, ŁĄCZCIE SIĘ!

адрэс РЭДАКЦЫІ І КАНТОРЫ: Менск, Пляц Волі № 17, 1-шы паверх

Тэл. Сакратара—№ 478, Рэдактара—№ 769, Канторы—№ 244, Сэктара прамысловасьці—№ 615

XI ГОД ВЫДАНЬНЯ ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

№ 47 (3136) ЧАЦЬВЕР 26 ЛЮТАГА 1931 ГОДУ

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.

падпісная плата:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

НА X УСЕБЕЛАРУСКІМ ЗЬЕЗЬДЗЕ САВЕТАЎ

Даклад тав. ГАЛАДЗЕДА

3. Аб беларусізацыі

На мінулым Зьезьдзе Саветаў я адрабязна застанавіўся на гэтым пытаньні. У нас ёсьць шмат пастаноў. Цяпер па гэтаму пытаньню я хачу адкрэсьліць наступнае—трэба ўжо на зьезьдзе заявіць, што дастаткова агітаваць за беларускую мову. Трэба давяраць як выконваюцца дырэктывы партыі і Ўраду аб правядзеньні беларусізацыі. Іменна так мы і падыходзім цяпер да пытаньня беларусізацыі.

Няма ніякага сумненьня аб тым, што ў нас ёсьць агромністыя дасягненьні ў справе беларусізацыі. Сёньня ўжо беларуская мова ўвайшла ў быт асноўных пралетарскіх мас і ўсёй нашай савецкай грамадзкасьці. Але ёсьць яшчэ некаторыя супраціўляючыяся элементы, а таксама і такія людзі, якія недаацэньваюць значэньня беларусізацыі. таму мы вынесьлі пастанову аб тым, каб нацкамісія, якая знаходзіцца пры ЦВК БССР, занялася-б спэцыяльнай праверкай гаспадарчых савецкіх і грамадзкіх установ—як яны ажыцьцяўляюць дырэктывы наконт беларусізацыі. У бліжэйшы час, адразу пасьля зьезду нацкамісія возьмецца за фактычную праверку.

Я павінен адзначыць, што калі выяшла ў быт асноўных пралетарскіх мас і ўсёй нашай савецкай грамадзкасьці. Але ёсьць яшчэ некаторыя супраціўляючыяся элементы, а таксама і такія людзі, якія недаацэньваюць значэньня беларусізацыі. таму мы вынесьлі пастанову аб тым, каб нацкамісія, якая знаходзіцца пры ЦВК БССР, занялася-б спэцыяльнай праверкай гаспадарчых савецкіх і грамадзкіх установ—як яны ажыцьцяўляюць дырэктывы наконт беларусізацыі. У бліжэйшы час, адразу пасьля зьезду нацкамісія возьмецца за фактычную праверку.

Я павінен адзначыць, што калі выяшла з боку таго ці іншага працаўніка нядбайная адносіны да гэтай важнейшай дырэктывы партыі і савецкага ўраду, то прыдзецца і ўсыпаць як належыць. Адсталых, як гаворацца, б'юць.

На гэтым я і хачу скончыць сваю справаздачу.

Якія-ж агульныя вынікі можна зрабіць з тэй справаздачы, якую я вам далажыў?

Першае, гэта тое, што мы ўступілі ў пэрыяд сацыялізму. Мы ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі завяршым пабудову грунту сацыялістычнай эканомікі.

Наша асноўная задача ўдзесяцярыць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, драцца за тэмпы.

Другая задача—біцца за якасьць працы, біцца за выкананьне народнагаспадарчага пляну 1931 г., як рашаючага году пяцігодкі. Удзесяцярыць тэмпы калектывізацыі, па-бальшавіцку вырашыць праблему жывёлагадоўлі, яшчэ больш узмацняць саюз рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства, на падставе новых вытворчых форм змычкі.

Наш рост справаджаецца вялікімі цяжкасьцямі. Гэтыя цяжкасьці, у асноўным, зьвязаны з клясававай барацьбой, якая праходзіць у абвостраных формах.

Наша задача бачыць цяжкасьці, якія стаяць на шляху сацыялістычнай будоўлі, мабілізаваць мільённыя масы рабочых і працоўнага сялянства на пасьпяховае асіленьне гэтых цяжкасьцяй.

Тав. Сталін сказаў, што нашы цяжкасьці зьяўляюцца такімі цяжкасьцямі, у якіх заложаны магчымасьці іх асіленьня.

Яшчэ адна задача, якая стаіць перад намі—гэта рашучая барацьба за зьнішчэньне недахопаў у нашай практычнай працы, якія яшчэ маюць месца.

Мэтадамі бальшавіцкай самакрытыкі, уцягваючы шырокія масы працоўных у гэтую самакрытыку, зьнішчыць гэтыя недахопы. Разгортваць і на далей мэтады сацыялістычнай працы: сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва і г. д. Гэта дапаможа праяўленьню творчага энтузіязму і мабілізацыі агромністых рэсурсаў, заложаных у самой сыстэме савецкай дзяржавы.

Шчыльней згуртавацца навокал камуністычнай партыі, узьняць ролю саветаў, палепшыць іх працу. Пад сьцягам і пад кіраўніцтвам партыі і яе ЦК, пад кіраўніцтвам правадыра працоўных усяго сьвету тав. Сталіна—да новых перамог. (Бурныя воплескі).

Прамова Нам. Старшыні СНК БССР тав. Бэнэка

Таварышы, Х-ты Зьезд Саветаў Беларусі сабраўся на пачатку 3 рашаючага году пяцігодкі. Намёткі першых двух год пяцігодкі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, рабочай клясай у саюзе з асноўнымі масамі сялянства выкананы з посьпехам. Мы амаль па ўсіх паказьніках маем перавыкананьне намётак пяцігадовага пляну. Калі мы паглядзім на лічбы росту нашай гаспадаркі на працягу двух апошніх гадоў, мы ўбачым, што мы можам ня толькі раўняцца ў росьце з якімі-небудзь краі намі, але мы ня ўбачым ніколі ў гісторыі такіх вялізарных тэмпаў будаўніцтва, якія мае наш Савецкі Саюз. Нашыя посьпехі на будаўніцтву нашай гаспадаркі праходзілі ня толькі ў барацьбе супроць клясавых ворагаў, супроць кулака на вёсцы і нэпмана ў горадзе супроць шкоднікаў--агентаў міжнароднай буржуазіі. Гэтых посьпехаў таксама ў барацьбе супроць правага ўхілу, які зьяўляецца найбольш небясьпечным на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, і супроць усякіх праяў «левых» загібаў і г. д. І толькі дзякуючы таму, што гэтая лінія партыі праводзілася Саветамі, што гэтую лінію падтрымоўвалі найшырачэйшыя масы рабочых і сялян, мы можам зараз, падлічваючы нашы посьпехі, намячаць новыя пляны і ісьці далей па шляху разгортваньня нашага будаўніцтва і выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады.

3-ці год пяцігодкі, у які мы зараз уступілі, зьяўляецца рашаючым годам.

Т. Сладэр ударніца фабрыкі «Камінтэрн» (Гомель) актыўная ўдзельніца «рапарту мільёнаў».

І таму тэмпы, якія мы зараз бярэм, у некалькі разоў перавышаюць па нашых галінах народнай гаспадаркі тыя тэмпы, якія мы мелі ў папярэдні два гады пяцігодкі. Таму таварышы, мы маем рад дадатковых цяжкасьцяй, якія трэба будзе перамагчы чоткаю пастаноўкай працы, лепшай працай у нашых савецкіх установах і яшчэ большай мабілізацыяй працоўных мас на выкананьне пяцігодкі. Зараз мы ставім перад сабой задачу ня толькі выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады, а ставім ужо пытаньне аб тым, каб на працягу 3-га рашаючага году выканаць па паасобных рашаючых галінах нашай прамысловасьці пяцігодку ў 3 гады. У гэтым годзе па паасобных галінах нашай вытворчасьці ўжо даганяем такія краіны, як Англія. Мы ў гэтым годзе, калі выканаем наш плян (а мы ўпэўнены ў тым, што ён будзе выкананы), дагонім і нават перагонім Англію ў вытворчасьці мэталю. Гэта значыць, што на справе ажыцьцяўляецца лёзунг партыі—дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны ў тэхніка-эканамічных адносінах.

Зараз, таварышы, наша краіна, дзякуючы таму, што мы выконваем пяцігодку ў больш карацейшыя тэрміны, чым раней вызначылі, мае магчымасьць ліквідаваць беспрацоўе амаль цалкам. У нас па сутнасьці зараз беспрацоўя няма. Асабліва зараз у нас стаіць цяжка справа з кваліфікаванымі кадрамі. У той час, як буржуазны сьвет перажывае вялізарныя цяжкасьці, калі ў капіталістычным сьвеце ёсьць 35 міл. беспрацоўных, калі ў Бэрлінe—сталіцы Нямеччыны, у гэтым годзе было каля 2-х тысяч самагубстваў на грунце голаду, на грунце беспрацоўя, наш Савецкі Саюз мае значны рост. З другога боку, калі мы паглядзім на той страшэнны эканамічны крызіс, які маецца ва ўсім сьвеце, для нас, таварышы, зусім яскравым стане, што капіталістычны сьвет ня выйдзе з гэтых цяжкасьцяй таму, што ў яго гэтыя цяжкасьці дайшлі да таго пункту, калі капіталізм стаў супроць, стаў папярок дарогі далейшага разгортваньня навукі і тэхнікі. Адзін з нямецкіх генэралаў, які заняўся зараз пісьмовымі творамі пішна, што трэба спыніць, затармазіць далейшае разьвіцьцё навукі, бо далейшае разьвіцьцё навукі і тэхнікі прывядзе да зусім непажаданых вынікаў. Вось да чаго дайшоў капіталістычны сьвет, у той самы час, калі мы, таварышы, зараз уводзім і ўжо ўводзім ўсеагульнае навучаньне, калі мы будуем новыя навучальныя ўстановы. Зараз нямногія дзяржавы могуць пахваліцца такім вялікім процантам навучаньня, як х мы зараз маем у Савецкім Саюзе і гэта, таварышы, усё робіцца без усялякай падтрымкі, без усялякіх крэдытаў з боку капіталістычных дзяржаў, а наадварот, пры актыўным супраціўленьні, пры актыўнай перашкодзе з іх боку.

З-за супроць [illegible] вае новыя «адмяжаваньні» (гэта ўжо апошняе, як кажуць, вынаходзіцтва буржуазіі), што ў нас у Савецкім Саюзе існуе «рабскі труд», што ў нас працуюць усе, як рабы, і цікавая рэч—як гэта «рабы» будуюць сацыялізм і падымаюць культуру і тэхніку. У той час, калі амаль ва ўсіх краінах маюцца мільёны беспрацоўных, якія шукаюць работы, у той час, як у многіх буржуазных краінах маюцца мільёны рабоў, якія прададуюцца і купляюцца, буржуазія зараз рабочым усяго сьвету, сваім рабочым хоча расказваць аб тым, што ў нас маецца «рабскі труд». Буржуазія, зразумелая рэч, хлусіць. У гэта ня толькі рабочыя іншых краін не паверацъ, але гэтаму не паверацъ нават і некаторыя здаравомыслячыя і некалькі вадаючыя Савецкі Саюз—буржуазныя дзеячы.

Ня гледзячы на ўсе тыя кампаніі, якія вядуцца супроць Савецкага Саюзу, ня гледзячы на ўсе гэтыя цяжкасьці і перабоі, якія мы зараз наглядаем, мы цьвёрда перад сабой ставім задачу ў гэтым годзе ўсе выначаныя паказьнікі пяцігадовага пляну ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, выканаць і нават перавыканаць.

Я хачу застанавіцца на некалькіх, акрамя гэтага, канкрэтных пытаньнях у сувязі з дакладам т. Галадзеда Мы зараз знаходзімся ў такім становішчы, калі амаль усе пытаньні гаспадарчага будаўніцтва ўпіраюцца ў транспарт. Мы, таварышы, у гэтым годзе, а таксама і ў мінулыя гады ўклалі значную суму сродкаў у наш транспарт, у наша шляхавае будаўніцтва, але трэба адзначыць, што калі мы можам пахваліцца ва ўсіх галінах значнымі посьпехамі, то ў галіне транспарту, дарожнага будаўніцтва мы далёка адстаем ня толькі таму, што мы даем мала сродкаў на гэта, але таму, што да гэтай справы няма ўвагі на мясцох. У гэтым годзе ў дарожнае будаўніцтва мы ўкладаем 18 міл. руб. Гэта сума немаленькая, гэта сума значная і калі мы на раённых зьездах саветаў, на ўсялякага роду сходах можам пачуць гупаркі аб чым хочаце, то наконт дарожнага будаўніцтва мы чуем вельмі і вельмі мала. Трэба справу дарожнага будаўніцтва вынесьці на шырокае абгаварэньне працоўных мас, трэба гэтую справу паставіць у сельсаветах, у калгасах. Трэба мабілізаваць вакол гэтай справы савецкую грамадзкасьць, трэба ажывіць работу аўтадору і справу дарожнага будаўніцтва трэба паставіць пад грамадзкі кантроль, чаго да гэтага часу ў нас ня было. Трэба, каб аб важнасьці дарожнага будаўніцтва ведалі працоўныя масы. Мы да канца гэтага году будзем мець ужо аўтамабілі, якія будуць вылічвацца дзесяткамі тысяч па СССР. Гэта, таварышы, ужо не старая Расія, а гэта Савецкі Саюз, які пераходзіць на машыны, на трактары, на аўтамабілі і г. д. і таму, трэба тэтым машынам даць дарогу. Трэба зьвязаць горад з вёскай, чаго да гэтага часу мы не ажыцьцяўлялі цалкам, але што мы павінны ажыцьцявіць. Я, таварышы, лічу, што калі мы будзем заставацца з такімі дарогамі, як да гэтага часу, мы не пасьпеем на фабрыках вырабляць машыны, бо мы іх будзем вельмі часта ламаць. Ёсьць такая ўстаноўка: «дайце машыну, дарога будзе». Гэта правільна, я з гэтым згаджаюся, што калі мы дадзім машыну, машына праложыць са бе дарогу. Але чакаць таго часу, покуль машына прыдзе і яшчэ зараз не рабіць, гэта пегадзіцца.

Мы ў сувязі з ростам нашай гаспадаркі значна павялічваем перавозкі. Вы ўсе ведаеце, з якімі цяжкасьцямі нам прышлося сустрэцца ў гэтым годзе пры бульбазагатоўках, калі мы бачылі, як селянін якіх-небудзь 25 кілёмэтраў ехаў на працягу 7-10 гадзін і вярочаўся да сябе на вёску бяз воза. Чаму?—Таму, што і воз у яго дрэнны, а дарога яшчэ горшая. Мы да гэтага часу выкарыстоўвалі вельмі дрэнна нашы шосавыя дарогі. На будучы год мы вызначаем больш магутны рух наперад. Мы лічым, што мы павінны пасеяць каля 700 тысяч га бульбы—гэта тэхнічная культура, адна з асноўных у [illegible] ліну, канапель.

Далей наконт сувязі. Пытаньне сувязі зараз набывае вялізарнейшае значэньне, бо сувязь таксама зьвязвае калгасную вёску з пралетарскім цэнтрам, з пралетарскім горадам.

Мы праз сувязь можам шмат чаго даць вёсны, можна даць канцэрты, можам даць аператыўна ўсякага роду зьвесткі аб тым, што робіцца на сьвеце, можам чытаць лекцыі. Мы ня можам паслаць у кожную вёску падрыхтаванага лектара, а гэта можна зрабіць зусім лёгка пры радыё. А ў нас сувязь, трэба прызнацца, пастаўлена дрэнна. Сувязь не адпавядае тым запатрабаваньням, якія ставіць перад намі растучая сацыялістычная гаспадарка, і запатрабаваньням працоўных мас Савецкай Беларусі.

Таму трэба на мясцох сувязі ўдзяліць больш увагі, чым да гэтага часу ўдзялялася. Таксама трэба будзе, каб нашы працаўнікі сувязі працавалі лепш, чым да гэтага часу працуюць.

А што мы маем на справе? На самой справе мы маем цэлы шэраг прарываў, якія трэба будзе ліквідаваць.

Ня ўсе працаўнікі сувязі сур'ёзна адносяцца да вывучэньня беларускай мовы. Мы маем яшчэ цэлы шэраг вялікадзяржаўных чыноўнікаў, якія лічаць, што беларуская мова зьяўляецца штучнай мовай, якой ня трэба ўдзяляць вялікай увагі, бо гэта мужыцкая мова, якая ня мае ніякай будучыні. З такімі настроямі трэба весьці самую рашучую барацьбу—аж да зьнятьця з працы і выгнаць трэба з саюзу такіх чыноўнікаў, выгнаць трэба з нашых пралетарскіх арганізацый, бо гэтыя вялікадзяржаўныя выхадкі зьяўляюцца контр-рэвалюцыйнымі спробамі, якія могуць, калі мы будзем мала зьвяртаць увагі, ператварыцца ў зусім адкрытыя контр-рэвалюцыйныя ўчынкі.

І апошняе, над чым я хацеў спыніцца,—гэта наконт нашых раёнаў і гаспадарчых арганізацый, якія працуюць у раёнах. Мы маем зараз такія зьявішчы, калі многія гаспадарчыя арганізацыі, якія знаходзяцца ў раёнах, адносяцца да райвыканкомаў і сельсветаў так, як кулак да батрака. Я лічу, што трэба з гэтым скончыць. Трэба, каб Райвыканком быў гаспадаром. Нельга ставіць так пытаньне, як многія ставяць—чаму ты нічога не зрабіў,—таму, што райвыканком нічога не зрабіў. Як быццам райвыканком павінен рабіць за ўсіх, а атрамністыя штаты ў нашых леспрамгасах, у саўгасах, у начальнікаў будаўнічых работ і г. д., зьяўляюцца безадказнымі і нічога могуць не рабіць. Яны ня хочуць пайсьці да селяніна, яны ня хочуць пагаварыць з селянінам аб тым ці іншай справе, якую трэба зараз праводзіць. Яны прывыклі да таго, каб увесьці ружаванасьць, каб праводзіць працу адміністратыўным, а не палітычным шляхам. Трэба будзе прызвычаіць да таго, што райвыканком адказвае за ўсю работу ў раёне.

За безабразіе ў саміх арганізацыях павінны адказваць іх кіраўнікі.

(Голас з месца—правільна).

Возьміце вы загатоўкі. У гэтым годзе плян загатовак ідзе нездавальняюча ў некаторых галінах, ня гледзячы на тое, што працуюць усе і ячэйкі і сельсаветы і РАК, не працуе толькі загатоўчы аварат, не працуе канцэрацыя. Нават тое, што сельсаветы загатовят шляхам развёртваньня грамадзкасьці і арганізацыі бяднацка-серэдняцкіх мас не заўсёды, як след, прымае наша загатоўчая сетка.

Мы маем цэлы шэраг выпадкаў, калі прыкашчык адносіцца да селяніна, да калгасьніка ня так, як павінен адносіцца савецкі працаўнік, савецкая канцэрацыя да працоўных. Трэба будзе зрабіць так, каб мы ў будучую загатоўчую тое самае у нашых [illegible] ў адзін голас кажуць, што нашы леспрамгасы ў значнай сваёй частцы гэта не савецкія ўстановы, што там трэба правесьці самую жорсткую чыстку, але нажаль мы зараз знаходзімся ў такім становішчы, пры якім мы ня можам гэтага зрабіць на працягу бліжэйшых тыдняў.

Таксама трэба пераглядзець тыя арганізацыі, якія займаюцца дарожным будаўніцтвам. Ёсьць у нас у Беларусі дзесяткі тысяч рабочых, сялян беднякоў, якія ўсё сваё жыцьцё працавалі ў лесе, якія маюць вялікую практыку. Іх трэба даць некаторыя веды, іх трэба навучыць проста пісьменнасьці і яны будуць добрымі дзесятнікамі, лепшымі, чым многія тыя, «спэцыялістыя», якія ў нас зараз працуюць. Трэба толькі за хацець гэта зрабіць, а гэта трэба зрабіць і тады будучыя загатоўкі, у прыватнасьці загатоўка лесу пойдуць лепш Мы маем выпадкі, калі прыходзяць у СНК з прэтэнзіямі пасьля таго, як бюджэт зацверджаны, пасьля таго, як усе сродкі разасыпаваны, прыходзяць зь патрабаваньнямі аб тым, што той ці іншы раён выдаткоўваў 40-50 тысяч рублёў, а некаторыя гарады дазволілі сабе выдаткоўваць 300.000 рублёў ўне ўсялякіх плянаў, уне ўсялякіх бюджэтаў. Гэта надалей цярпець немагчыма ні ў якім выпадку. У нас маецца 100 раёнаў і акрамя таго маецца некалькі самастойных гарадзкіх саветаў. Калі ўсе пачнуць так рабіць, дык будуць увесь час прарывы ў бюджэце і ў пляне і тады мы ня зможам, як сьлед выконваць тых намётак, якія маюцца ў нашым пляне. Таму дысцыпліна ў нашай працы павінна адыгрываць большую ролю, чым да гэтага часу адыгрывала. Я лічу, што калі мы гэтыя практычныя мерапрыемствы прымем пад увагу, калі мы будзем гэтага прытрымлівацца, дык мы з меншай колькасьцю ўсякіх перабояў зможам закончыць трэці рашаючы год пяцігодкі, а калі будзе кожны працаваць на свой лад, калі кожны будзе працаваць у ойбе ў раёне, як ён хоча, ня будзе выконваць тых указаньняў і плянаў, якія даюцца, зразумела, будуць дадатковыя цяжкасьці. Пляны, якія зацьвярджаюцца ўрадам і дырэктыўнымі органамі, трэба выконваць.

Я лічу, што таварышы з раёнаў улічаць усё гэта ў сваёй практычнай працы і зразумеюць, і тады нам лягчэй будзе весьці працу па выкананьні трэцяга рашаючага году пяцігодкі (воплескі).

ШТУРМУЕМ ПРАРЫВЫ ПА ЗАГАТОЎКАХ.

УЧОРА НА ЗЬЕЗДЗЕ

▲ Старшынствуючы тав. Цімашэнка адчыняе 10-ае паседжаньне зьезду. Працягваюцца спрэчкі па дакладах т. т. Рачыцкага і Міцькова. Жадаючых выказацца шмат.

▲ Дасягненьні у галіне рэконструкцыі сельскае гаспадаркі, відавочны ня толькі нам, але і нашым ворагам. Не дарэмна капіталісты так «непакоюць» за нашу пяцігодку, яна стаіць ім паперак горла.

▲ На мясцох некаторыя працаўнікі кажуць, што бедната ня ідзе ў калгас. Гэта думка няправільная, апартуністычная,—гаворыць тав. Цуканаў.

▲ Трэба паставіць работу на правільныя бальшавіцкія рэйкі і тады мы будзем сьведкамі вялізарнейшага прыбыву ў калгасы. Мы не скарыстоўваем магчымасьці для папулярызацыі пред бяднацка-серадняцкіх мас вёскі пытаньняў калгаснага будаўніцтва,—заўважае тав. Вінаградаў.

▲ Калгасныя паседзелкі, чырвоныя вяты, даклады калгасаў аб выніках гаспадарчага году—мэтады, якія трэба шырока ўжываць.

Вобразная прамова калгасьніка Мацыёна ўвесь час спынялася воплескамі.

▲ Пляны сяўбы ўпаўне рэальныя. Трэба толькі па-ўдарнаму змагацца за іх выкананьне:—голас усіх дэлегатаў зьезду.

▲ Сельсаветы павінны канчаткова павярнуцца тварам да калектывізацыі, да пасьпяховага правядзеньня другой бальшавіцкай вясны.

▲ Дружна, агульнымі сіламі, пад кіраўніцтвам нашай партыі ў бой за другую бальшавіцкую,—гаворыць тав. Муха (Церахаўскі раён).

Мы да вясны гатовы,—рапартуе ў сваёй прамове калгасьніца калгасу тав. Чарвякова (Койданаўскі раён).

Трэба быць усім гатовымі, усе пляны павінны быць ажыцьцёўлены. Трэба больш рашуча весьці барацьбу з кулацтвам.

▲ У Горацкім раёне былыя папы і кулаччо было арганізавалі свой калгас і далі яму назву імя Прышчэпава. Што гэта, як не адкрытае выступленьне клясавага ворага. Але мы гэты калгас пры дапамозе бяднацка-серадняцкіх мас ліквідавалі і арганізавалі сапраўдны з беднякоў і сераднякоў,—падаў гэты факт у сваім выступленьні тав. Тутар.

▲ Не супакойвацца на колькасных паказьніках, а змагацца за якасьць.—У нас, кажа тав. Лосеў (Рагачэўшчына) на мясцох арганізуюць калгас і супакойваюцца. Забываюцца пра замацаваньне арганізаваных і існуючых калгасаў.

▲ Сваячасова загатаваць насеньне, лепш скарыстаць мясцовыя рэсурсы, адрамантаваць інвэнтар, выйсьці ў поле ва ўсеаружжы, змагацца за кожнага новага калгасьніка,—дырэктыўна гучэла з вуснаў кожнага выступаўшага дэлегата.

▲ У спрэчках па дакладах т. т. Рачыцкага і Міцькова выказаліся больш 50 чалавек. Паступае прапанова спыніць спрэчкі і яны спыняюцца.

▲ З заключным словам выступае Наркамзем тав. Рачыцкі.

— Яшчэ больш рашуча даваць адпор апартуністам, ныцікам, нацдэмам, і іншым ворагам дыктатуры пралетарыяту.

— Рашуча змагаючыся за генэральную лінію партыі, наперад, за выкананьне сацыялістычнай праграмы, да новых перамог,—закончыў пад воплескі сваё заключнае слова тав. Рачыцкі.

▲ Зьезд выносіць пастанову ўстанавіць пераходны сьцяг імя Х Усебеларускага зьезду саветаў для раёну, які лепш правядзе другую бальшавіцкую вясну.

▲ Вячэрняе паседжаньне. Зьезд з вялікай увагай, больш таго з вялікім уздымам слухае сымфонію лічбаў і фактаў,—сымфонію нячуванага росту індустрыялізацыі БССР.

▲ Сымфоніі бываюць розныя. У капіталістычных дзяржавах «сымфонію»

Дэлегатка зьезду, работніца т. БУРАК.

лічбаў адбівае галеча рабочых і працоўных мас. 35 мільёнаў беспрацоўных. Тысячы самазабойстваў ад голаду там, дзе хлеб спальваецца, або выкідваецца ў мора. Сотні банкрутстваў банкаў. Штодзённае закрыцьцё фабрык і заводаў. Ад гэтай сымфоніі імпэрыялісты прыходзяць у сьмяротны жах, бо адчуваюць свой блізкі канец.

▲ Сымфонія лічбаў у нас—гэта сымфонія, якая падымае бадзёрасьць, павялічвае энтузіязм. Кожная нотка ў гэтай сымфоніі сьпявае аб нябачаным росьце, аб набліжэньні да сацыялізму. Гэта сымфонія захапляе. Яна ўзьнімае энтузіязм да далейшых перамог.

▲ Лічбы з дакладу старшыні ВСНГБ тав. Грысевіча ўліваюць новую энэргію, узьнімаюць настрой і энтузіязм рабочай клясы і працоўных, яны ўбіваюць кол у сьпіну сусьветнаму капіталу.

▲ Паводле меркаваньняў пяцігодкі, у капітальнае будаўніцтва рэспубліканскай прамысловасьці ВСНГБ трэба было за 2 гады ўкласьці 55 мільёнаў руб., а фактычна ўкладзена—58 млн. р.

▲ Выпуск прадукцыі за час з IX Усебеларускага зьезду саветаў узрос на 155 проц., між тым, як гэтым зьездам рост быў зацьверджаны ў 87 проц.

▲ Па пяцігодцы ў 1929-30 г. у прамысловасьці павінна было быць занята 36.400 рабочых, а фактычна занята 46.800.

▲ За 2 гады ўведзены ў строй Асінбуд, Гомсельмаш, Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат, Менская і Віцебская швэйныя фабрыкі, Магілеўская фабрыка штучнага валакна, за палкавая фабрыка «Пралетарская Перамога», Аршанскі ільнакамбінат і рад іншых.

▲ Павялічылася намінальная зарплата рабочых у сярэднім на 16 проц.

▲ Значна павялічыўся ахоп сацыяльна-бытавым абслугоўваньнем рабочых.

▲ Паводле пяцігодкі, у 1929-30 г. трэба было выпусьціць валавой прадукцыі на 222,7 млн. руб., а выпушчана на 294 млн. руб.

▲ У дакладзе было рад і трывожных месц. Недастаткова змагаемся за якасьць. Мала зварачаем увагі на мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў. Ня ўсюды на належнай вышыні працоўная дысцыпліна. Слаба змагаемся за аўладаньне тэхнікай, за мэтазгоднае і поўнае скарыстаньне існуючага абсталяваньня.

▲ У заключэньне вячэрняга паседжаньня зьезд заслухаў прывітаньні ад інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў Галоўдартрансу, студэнтаў і навуковых працаўнікоў ад хіміка-тэхналёгічнага інстытуту хімічнага тэхнікуму і рабфаку, прадстаўніка рабочых ф-кі «Камінтэрн» (Нова-Барысаў).

▲ Вітала зьезд дэлегацыя беларускіх, польскіх і яўрэйскіх пісьменьнікаў. У сваім прывітальным слове ад дэлегацыі пісьменьнікаў тав. Лімановускі спыніўся на ролі пралетарскага пісьменьніка ў сацыялістычным будаўніцтве і заявіў, што нашы пралетарскія пісьменьнікі будуць змагацца за стварэньне беларускай культуры на-цыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьмесьце, будуць рашуча выкарчоўваць карэньні контр-рэвалюцыйнага нацдэмакратызму. Пісьменьнікі паўдарнаму будуць шляхам мастацкага паказу змагацца за выкананьне задач, пастаўленых партыяй і ўрадам.

▲ З чытаньнем сваіх твораў на зьезьдзе выступілі пісьменьнікі: Андрэй Александровіч, Федарэ'ч, (БелАПП), ад яўрэйскай сэкцыі—Мысьлінскі, ад «Узвышша»—Краціва, ад «Полымя»—Чарот.

Громам воплескаў сустракаў зьезд выступленьні кожнага пісьменьніка.

▲ З вялікім адказным словам па прывітаньні выступіў ад імя зьезду член прэзыдыуму—адказны рэдактар ЦК КПБ(б)Б «Зьвязда»—тав. Будзінскі. Прамова тав. Будзінскага часта перарывалася воплескамі. Тав. Будзінскі спыняецца на задачах, якія стаяць перад працоўнай інтэлігенцыяй ў пэрыяд, калі мы ўвайшлі ў сацыялізм.

— Няхай жыве наша працоўная інтэлігенцыя, якая ідзе з намі!

— Няхай жывуць рабочыя, якія ідуць у ВНУ, каб даць пралетарскія кадры інтэлігенцыі!

— Няхай жывуць пралетарскія пісьменьнікі!—так закончыў пад гром воплескаў сваю прамову тав. Будзінскі.

ПАСТАНОВА

Х-га Усебеларускага Зьезду Саветаў

АБ УСТАНАЎЛЕНЬНІ ПЕРАХОДНАГА СЬЦЯГУ «ІМЯ Х-га ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ БССР» ДЛЯ ЎЗНАГАРОДЫ РАЁНУ ЗА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ І АРГАНІЗАЦЫІ КАЛГАСАЎ.

Надаючы вялізарнае значэньне пасьпяховаму правядзеньню другой бальшавіцкай вясны, Х Усебеларускі Зьезд Саветаў заклікае ўсіх рабочых, работніц, калгасьнікаў і бяднацка-серадняцкае сялянства і ўсе грамадзкія арганізацыі БССР да мабілізацыі ўсіх сіл для найбольш пасьпяховага выкананьня задач другой бальшавіцкай вясны і арганізацыі калгасаў.

У мэтах арганізацыі сацспаборніцтва паміж раёнамі, сельсаветамі, калгасамі і саўгасамі для дасягненьня лепшых посьпехаў у правядзеньні гэтай кампаніі, Х Усебеларускі Зьезд Саветаў устанаўлівае пераходны сьцяг «імя Х Зьезду Саветаў БССР» дзеля ўзнагароды раёну за лепшае правядзеньне другой бальшавіцкай сяўбы і арганізацыі калгасаў.

Старшыня Х Усебеларускага Зьезду Саветаў А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар Х Усебеларускага Зьезду Саветаў А. ХАЦКЕВІЧ.

25 лютага, 1931 г.
г. Менск.

Да Х-га Усебеларускага Зьезду Саветаў

Сёньня, на ранішнім паладжэньні Х-га Усебеларускага Зьезду Саветаў адбудуцца спрэчкі па дакладу ВСНГ БССР; на вячэрнім паседжэньні—спрэчкі і заключнае слова тав. Грысевіча па дакладу ВСНГ БССР.

САКРАТАР Х УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ.
А. ХАЦКЕВІЧ.

Сёньня 26-II а 5-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні дому Культуры (сцэна) адбудзецца паседжаньне Мандатнай Камісіі Х-га Усебеларускага Зьезду Саветаў.

Яўка ўсіх членаў Мандатнай Камісіі абавязкова.

Мандатная Камісія.

Зьезд абраў камісію для складаньня рэзалюцыі па дакладу В. Рачыцкага і Міцькова

Рачыцкі, Міцькоў, Грыбенчык, Аўчынпнікаў, Шаранговіч, Бэнэк, Ластоўскі, Манжалей, Цімашэнка, Гурыновіч, Чарвякоў, Масюкоў, Гравіт, Муха, Сапрыцкі, Сьцяпанаў, Лоцманаў, Жогаў, Шэле, Камаеў, Цэвак, Вінаградаў, Плавароў, Нароенко, Жорны, Трусава, Ржнаўскі, Паніматка, Чэрняк, Векслер, Авсянко, Трухачонак, Грузакоў, Рагозіна, Вайцэховіч, Калодка, Кудзелька, Папугай, Піліпенка, Юрчэнка, Рублеўская, Вароніч, Недапытальская, Шастакоў, Шлейфер, Кадукоў, Кардашэнка, Бутар, Ганін, Мацкевіч, Сокалаў, Матус, Гайдук.

Ударнік фабрыкі «камінтэрн» (Гомель) актыўны ўдзельнік «рапарту мільёнаў».

т. Іваішын

Усегрузінскаму ЦВК і СНК

Х Зьезд Саветаў БССР ад імя пралетарскіх калгасных, бяднацка-серадняцкіх мас і ўсіх працоўных Савецкай Беларусі, шле гарачае прывітаньне Савецкай Грузіі, якая сьвяткуе дзесяцігодзьдзе ўстаноўленьня Савецкай ўлады.

Правільнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня і рашучая барацьба супроць вялікадзяржаўнага шавінізму і мясцовых шавінізмаў—нацыянал-дэмакратызму забяспечылі вялізарныя посьпехі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Грузіі за 10 год. Барацьба рабочае клясы і ўсіх працоўных Савецкай Грузіі пад кіраўніцтвам кампартыі за разгортваньне сацыялістычнага наступу на ўсім фронце на аснове генэральнай лініі партыі, бязьлітаснае выкарчоўваньне рэшткаў меншавікоў, забяспечваюць далейшыя посьпехі ў справе будаўніцтва сацыялістычнай культуры і гаспадаркі Грузіі.

Няхай жыве Савецкая Грузія.

Няхай жыве Камуністычная партыя—арганізатар і кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве Саюз ССР.

Старшыня Х Зьезду Саветаў БССР А.

На X Усебеларускім Зьезьдзе Саветаў

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ тав. ГАЛАДЗЕДА

22 лютага. Вячэрняе паседжаньне

Тав. Вакун
(Бярэзіна)

Ад імя рабочых фабрык „Чырвоная Бярэзіна“ і „Пралетарская Перамога“ я вітаю X ты Ўсебеларускі зьезд Саветаў (воплескі).

Тэза падкрэсьліць дасягненьні, якія мы маем за гэты год, а таксама ад значыць нашы недахопы. У нас па двух фабрыках арганізавана 112 ударных брыгад, 6 скразных брыгад, 4 калектывы, 10 камун. Ударнікаў на 2-х фабрыках 1453 чал.

Прамфінплян ударнага кварталу на „Чырвонай Бярэзіне“ выкананы на 90 проц., на „Пралетарскай Перамозе“—78,1 проц., па ватэрпасным цэху—93 проц. і па фанэрным—81 проц.

У студзені м-цы 1931 г. выканан прамфінплян на „Чырвонай Бярэзіне“ на 90,7 проц., на „Пралетарскай Перамозе“ на 87 проц., па ватэрпасным цэху на 73 проц. Тут ужо маецца процант меншы супроць асобнага кварталу. На фанэрнай вытворчасьці плян выкананы на 80 проц. Тут маецца недавыкананьне па цэлым радзе прычын. Папершае, у нас 2 дні тыдзень растой на абедзьвюх фабрыках з-за недастаткі сыраціны. У нашых органах забясьпечаньня прадпрыемстваў сыравінай ёсьць моманты простага шкодніцтва, выпадкі галавацяпства. Гэта агідна, калі кажуць, што выслалі 2 вагоны парафіну і хромпіку, а гэтыя 2 вагоны дасьці ў паветры зараз лётаюць. Цэлы месяц райпрыгоў, а сыравіны высланай няма. Былі растоі і з-за таго, што нам высылалі непатрэбныя матэрыялы: замест бензыны, якая нам патрэбна для выпальваньня сядзеньняў, нам прыслалі газу, а замест веравэннага масла—дзёгаць.

X-ты Ўсебеларускі зьезд Саветаў павінен зьвярнуць увагу на такія праявы шкодніцтва, зрываючыя выкананьне прамфінплану.

Тав. Корбут

У гэтым годзе мы працавалі калектыўна, арганізавана, па ударнаму выходзілі на суботнікі і нядзельнікі, а кулакі гаварылі, што мы ў кабалу лезем. Яны агітавалі нас супроць калектыву, але мы на слухалі іх: на сходах мы за іх не галасавалі, бо нам ня трэба кулацтва. Дзякуючы савецкай ўладзе, дзякуючы камуністычнай партыі пад яе кіраўніцтвам мы ідзем наперад да сацыялізму.

Тав. Ветастанскі

Рост нашага сацыялістычнага будаўніцтва, рост нашай ня жкай індустрыі [illegible] мо нашай рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.

Наша задача заключаецца на толькі у тым, каб даць тэхнічна ўзброенага бойца, але мы з кожным годам даем дасягкі лепшых спэцыялістаў—трактарыстаў, шофараў, матацыклістаў пасылаем для сацыялістычнай вёскі, для сацыялістычнай прамысловасьці.

У сваіх радах мы налічваем 75 проц. ударнікаў партыйна-комсамольска прасло кі. Бранявік-рабочы ўдарнік гаво ыць, што толькі ў радах партыі, толькі пад непасрэдным кіраўніцтвам, у барацьбе з усякімі скажэньнямі генэральнай лініі партыі, а яе пераможнае правядзеньне мы зможам забясьпечыць абароназдольнасьць нашай краіны.

Тав. Кузьміч

Наш калгас імя Будзённага арганізаваўся ў 1929 г. Мы абвясьцілі сябе ударнікамі, ня гледзячы на асобныя цяжкасьці мы свае пляны перавыкананым.

Нас з-за мяжы запытваюць „як жывуць вашыя камісары, што вас прытэпітаюць?“ А мы адказваем: „у нас нямя камісараў—мы самі камісары“. Яны гаворыць „вас прымусам ганяюць на работу“, А мы адказваем: „мы самі гаспадары, мы самі на сябе працуем“.

Мы знаходзімся за 25 кілёметраў ад мясцовага арганізацыйнага пункту і мы часта ня можам нашу каровку, або цяля адвесьці на ветэрынарны пункт і зьвярнуцца за медычнай дапамогай для нашага дзіцяці. Я прасіў бы зьезд зьвярнуць на гэта ўвагу і прагуляваць гэта пытаньне.

Тав. Паляшчук.

Таварышы, перш-наперш лічу сваім абавязкам ад імя калгаснікаў калгасу „Праца“ перадаць шчырае прывітаньне нашаму X ўсебеларускаму зьезду саветаў.

Зараз я скажу некалькі слоў аб калектывізацыі нашай вёскі. Я лічу, што для нас гэта справа зьяўляецца неабходнай. Вярнуўшыся са зьезду мы павінны ўсе абвясьціць сябе ўдарнікамі ў правядзеньні калектывізацыі. Капіталісты рыхтуюць супроць нас вайну, але мы не павінны яе баяцца. Я стары чырвонаармеец, быў у Чырвонай арміі ў 1919-20 г. і гапаруся гэтым. Тады 2 гады мы хадзілі неабутыя і неадзетыя, на адной назе быў лапаць, другая нага была босая. Часта нам прыходзілася і галадаць. Але мы здолелі знішчыць арміі Калчака, Дзянікіна і інш. белагвардзейцаў. Зараз бачым, якія перад нашымі вачыма праходзяць каманды Чырвонай арміі для прывітаньня нашага зьезду, мы бачым, што гэта зусім ня тая Чырвоная армія, якая была ў 1918, 19 і 20 г. г. Зараз мы маем магутную, добра адзетую і добра ўзброеную армію і яна зьяўляецца цьвёрдай аховай і апорай нашай савецкай ўлады. З сучаснай нашай Чырвонай арміяй, з нашымі масамі ў калгасах мы будзем як моцны граніт, аб які разбіцца кожны, хто толькі адважыцца на нас напасьці.

Яцкевіч
(Менск)

Штогод расьце наша народная гаспадарка, расьце прамысловасьць, расьце сельская гаспадарка, асабліва яе сацыялістычны сэктар, і значна павялічыўся таваразварот. Се гэта прадяўляе надзвычайна высокія запатрабаваньні да нашага транспарта.

Наш транспарт зараз не спраўляецца са сваёй задачай абслугоўваньня народнай гаспадаркі. На справу дарожна будаўніцтва павінна быць зьвернута ўвага усіх савецкіх партыйных і грамадзкіх органаў. Плян першага году дарожнага будаўніцтва ня выканалі з прычыны таго, што дарожныя органы не справіліся з большавіцкімі тэмпамі будаўніцтва, якімі павінны былі працаваць. Апрача таго дарожныя органы не мелі належнай падтрымкі з боку ўсіх савецкіх арганізацый. Таму зараз тэмпы дарожнага будаўніцтва павінны быць значна большымі, чым былі у мінулым годзе.

Таму трэба зараз у бліжэйшы час дабіцца рашучага пералому гэтым у напрамку. У нас ёсьць закон адносна правядзеньня дарожнай працоўнай павіннасьці, але гэты закон на мясцох не выкарыстоўваецца. На 1931 г. трэба дабіцца таго, каб кожны сельсавет адказваў-бы за справу дарожнага будаўніцтва. Наабходна дапамогі [illegible] контролю за правай сыстэмы спажывецкай кааперацыі.

Трэба каб раивыканкомы, у першую чаргу нашы парт. арганізацыі, сельсаветы займаліся гэтай працай штодзень, а не ад выпадку да выпадку і тады, калі ужо зусім яркава выкрыты прарыў і прабел у самай працы.

У нас ня можа быць ніякіх супярэчнасьцяй наконт таго, што пляны загатовак неабходна абавязкова выканаць. Аднак цэлы рад вёзаў загатовак, як лён, нават хлебазагатоўкі, тады, калі яны ўжо маглі быць выкананы на 100 проц. гэтага яшчэ не зроблена. Значная частка хлеба, якая на сёньня не сабрана, лічыцца за кулаком. Гэта нам гаворыць аб тым, што мы гэтую справу як след на месцы не правялі. Тут на зьезьдзе мы павінны рашуча паставіць пытаньне аб тым, што ў бліжэйшыя тры тыдні мы павінны паставіць усе загатоўкі так, каб канчаткова выканаць пляны.

Цэнцыпер.—
(Наркамаховы здароўя)

У галіне аховы здароўя мы таксама як і ва ўсіх астатніх галінах нашай гаспадаркі маем рад вялікіх дасягненьняў! Досыць сказаць, што ў мінулым годзе праз нашы амбуляторыі прайшло 6 міл. хворых, праз хатнюю дапамогу мы абслужылі 3/4 міл. хворых. Наш каштарыс у мінулым годзе складаў 19 з паловай м., а ў гэтым годзе 30 млн. руб. Я лічу, што гэтыя лічбы досыць паказальныя.

У працы лекавых устаноў ёсьць недахопы, зусім правільна выступалі т. т., з раённых працаўнікоў, якія спыняліся на гэтым. Дзякуючы апартуністычнай недапэнцы ўстаноў, што ў свой час рыхтавалі кадры, мы зараз маем вузкае месца у адносінах кадраў для нашых лякавых устаноў. Па самых скромных падліках нам для задавальненьня раёнаў трэба ня менш 250-300 дактароў і значная колькасьць працаўнікоў сярэдняй кваліфікацыі. Тое, што мы зараз рыхтуем, зусім недастаткова. апошні выпуск Бел. Дзяржаўнага Медычнага І-ту даў усяго 80 чал., з якіх частку трэба было пакінуць у горадзе для падрыхтоўкі кадраў для кадраў. Мы маем 100 раёнаў. Таму зразумела, што мы не маглі задаволіць шмат каго і зараз мы ў раёнах маем вельмі нездаровае зьявішча в кадрамі. У пасабных працаўнікоў ёсьць думка аб тым, што у нас у горадзе шмат медычных працаўнікоў, якіх-можна было-б кінуць на вёскі. Але пры больш блізкім азнаямленьні з становішчам медычнага персаналу у гарадох прыходзіцца сказаць, што у горадзе лішніх працаўнікоў няма. Наадварот зараз, пры разгортваньні так званых дыспансэрных мэтадаў працы мы маем недахоп дактароў.

Мы ўваходзім у 3 год пяцігодкі. У галіне аховы здароўя ёсьць рад вялікіх заваёў. У гэтым годзе мы разгортваем каля 2 тыс. палявых ясляй на раёнах, куды мы зараз накіроўваем медычныя брыгады. Органы аховы здароўя патрабуюць дапамогі шырокай грамадзкасьці, каб зусім задачамі справіцца.

т. Хаськін
(Менск)

На базе разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва расьце дабрабыт працоўных мас гораду і вёскі, павялічваецца рабочая кляса, расьце калектывізацыя вёскі на базе гэтага росту значна ўзрастаюць запатрабаваньні працоўнага насельніцтва. Зараз гэты рост запатрабаваньняў наша краіна поўнасьцю задаволіць ня можа. Таму перад намі паўстае надзвычайна адказная задача рабочага забясьпячэньня. Асаблівая адказнасьць гэтай задачы ляжыцца на сыстэму спажывецкай кааперацыі.

Калі-ж паглядзім, як выконваецца гэтая важнейшая задача, дык мы бязумоўна прыдзем да таго выводу, што ў гэтым мы маем надзвычайна многа вялікіх недахопаў і прарываў; у першую чаргу гэта адносіцца да нездавальняючай працы самой сыстэмы спажывецкай кааперацыі. З боку вашых мясцовых арганізацый, савецкіх органаў, райвыканкомаў, сельсаветаў і інш. вашых грамадзкіх арганізацый яшчэ надзвычайна мала ўдзяляецца ўвага гэтаму важнейшаму пытаньню і надзвычайна мала ажыцьцяўляецца кантроль за работай кааперацыі. Я лічу, што тут на зьезьдзе Саветаў трэба вельмі рэзка паставіць пытаньне наконт неабходнасьці максымальнай увагі, кіраўніцтва і максымальнага кантролю за правай сыстэмы спажывецкай кааперацыі.

Трэба каб раивыканкомы, у першую чаргу нашы парт. арганізацыі, сельсаветы займаліся гэтай працай штодзень, а не ад выпадку да выпадку і тады, калі ужо зусім яркава выкрыты прарыў і прабел у самай працы.

У нас ня можа быць ніякіх супярэчнасьцяй наконт таго, што пляны загатовак неабходна абавязкова выканаць. Аднак цэлы рад вёзаў загатовак, як лён, нават хлебазагатоўкі, тады, калі яны ўжо маглі быць выкананы на 100 проц. гэтага яшчэ не зроблена. Значная частка хлеба, якая на сёньня не сабрана, лічыцца за кулаком. Гэта нам гаворыць аб тым, што мы гэтую справу як след на месцы не правялі. Тут на зьезьдзе мы павінны рашуча паставіць пытаньне аб тым, што ў бліжэйшыя тры тыдні мы павінны паставіць усе загатоўкі так, каб канчаткова выканаць пляны.

Тав. Элькіна
(Парыцкі раён)

Раней жанчыны былі прыгнечаны. Мы ня ведалі, што жанчыны могуць добра працаваць і думалі, што яны могуць толькі быць работніцамі ў полі, што яны могуць працаваць толькі па найму ў абшарнікаў. Савецкая ўлада вызваліла нас ад гэтага ўціску.

У нас арганізаваўся вялізарнейшы калгас. Мы бачым, што калгасы нашы забясьпечваюць рабочых лепш як адзіаасобнікі; калгаснікі лічаць, што патрэбна мець прадукты ня толькі для сябе, але для рабочых і працоўных гораду.

Жанчыны ведаюць, дзе наш вораг. Прыехаўшы да дому мы павінны арганізаваць гурт і ТД-авіяхаму і МОПР'у, мы павінны ісьці на перавязачныя курсы, на мэдычныя пункты і там вучыцца і рыхтавацца на той выпадак, калі будзе вайна, дык абараняць нашу краіну. (Воплескі).

Тав. Гнілякевіч.
(Наркамправы БССР)

У той час, калі ў капіталістычных краінах з кожным днём становішча рабочае клясы пагаршаецца, зарплата зьніжаецца, бесправоўе павялічваецца, —у нас, дзякуючы правільнай генэральнай лініі партыі, у гэтым годзе ўжо зусім ліквідавана беспрацоўе. Больш таго, наша соцыялістычнае будаўніцтва патрабуе ад нас падрыхтоўкі вялізарных кадраў. У першым квартале гэтага году нам патрэбна мець выключна для сэзонных работ 160 тыс. рабочых, у другім квартале 326800 чал., у 3-м квартале—311 т. і у 4 квартале—255700 рабочых.

Трэба гаспадарчым, прафэсыянальным і партыйным арганізацыям зьвярнуць больш увагі на падрыхтоўку рабочай сілы і на больш мэтазгоднае скарыстаньне той, што маецца.

Разьвіцьцё прамысловасьці і іншых галін народнай гаспадаркі патрабуе ўцягненьня вялікай колькасьці жаночай працы. Неабходна зьвярнуць увагу на пашырэньне сеткі дзіцячых ясляй і сталовак. Без вырашэньня пытаньня бытовых і культурных умоў мы ня зможам вырашыць пытаньне ўкараненьня жаночай працы ў нашу вытворчасьць.

т. Лаціс.
(Магілеў)

Таварышы, тыя дасягненьні, якія мы маем у галіне нашага сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляюцца вынікам правільнай генэральнай лініі нашай партыі, вынікам актыўнасьці рабочае клясы батракоў, беднякоў і серадняковаў.

У цэлым радзе месц цьвёрдыя заданні не даводзяцца сельсаветамі да кулацкага двара. У прыватнасьці у Магілеўскім раёне значныя недахопы ў гэтых адносінах. На нашым зьезьдзе мы гэтае пытаньне завастрылі. Трэба спадзявацца, што ў будучым мы гэтую работу разгорнем і сельсаветы сапраўды павінны зьявіцца праваднікамі дыктатуры пролетарыяту. Калі мы разгорнем барацьбу з кулаком як след, гэта будзе стымул м для далейшага разгортваньня нашага калгаснага будаўніцтва.

Мала гаварыць насельніцтву аб тым, што калгасная сыстэма мае перавагі, трэба паказаць на справе, што калгас сапраўды зьяўляецца паказьнікам гэтых пераваг, такія калгасы на тэрыторыі БССР ёсьць.

Кіраўніцтва ў нас нездавальняючае. Прыязджаючыя працаўнікі з раёнаў у сельсаветы і калгасы з цэнтру больш займаюцца толькі фіксацыяй і фатаграфіяй недахопаў, практычна не дапамагаючы рабоце нізавым працаўнікам. Трэба цьвёрда сказаць кожнаму, хто едзе ў калгас, альбо ў сельсавет, каб ён ся зеў да той пары, пакуль ня будуць вынішчаны недахопы, каб ён практычна дапамагаў як зьнішчыць недахопы і палепшыць працу.

Мы павінны зьвярнуць увагу на пытаньне падрыхтоўкі асабовага складу. І вось тут, калі паставіць пытаньне на сёньня парад калгасамі, што яны зрабілі на сеньняшні дзень ў адносінах абароны нашай краіны, та я вам скажу, што пераважная большасьць нічога не зрабіла. Кожны калгас абавязкова павінен пабудаваць сабе цір.

У нас у гэтым годзе разгортваецца надзвычайна вялікае дарожнае будаўніцтва. Мы будзем мець некаторыя цяжкасьці з гужавой сілай, рабочымі рукамі і г. д. Неабходна зараз-жа, каб усе, каму дорагі інтарэсы Кастрычнікавай рэвалюцыі, усьвядомілі, што на гэтую справу трэба мабілізаваць грамадзкую думку, трэба ўмець, выконваючы сваю працу па сельскай гаспадарцы, выдзеліць рабочую сілу, гужавую сілу для таго, каб сапраўды практычна ажыцьцявіць тыя пляны дарожнага будаўніцтва, якія намячаюцца на 1931 г. па БССР.

Гутаркі дэлегатаў перад уваходам упамяшканьне, дзе адбіваецца X зьезд Саветаў. На здымку: Народныя паэты Янка Купала і Якуб Колас сярод дэлегатаў зьезду.

Слова слаўных вартавых савецкіх межаў

Тав. Маер

Ад старажавога атраду чырвонай мяжы і ад унутраных войск АДПУ—Х му зьезду—гаспадару Савецкай Беларусі палкае чэкісцкае прывітаньне (воплескі).

Таварышы, ваш зьезд адбываецца ў важных міжнародных абставінах. Зараз з кожным днём усё шырыцца і ўзрастае эканамічны крызіс, перарастаючы ў палітычны. Усе імпэрыялістычныя краіны ахоплены гэтым крызісам, гэты крызіс сьціскае горла капіталізму, які бьецца ў апошніх сударгах. У той-жа самы час зусім процілеглае зьявішча мы наглядаем у нашым Савецкім Саюзе—кожны дзень растуць новыя будынкі, з кожным днём мацнее фундамант сацыялістычнай эканомікі ў нашым Савецкім Саюзе.

Ад ыўшыйся нядаўна працэс „прампартыі“ з усёй яснасьцю пакazаў, што буржуазія ні на хвіліну ня кідае думкі схапіцца з намі.

Капітал зм з эканамічнага крызісу, сьціскаючага яго горла шукае выхад у вайне. І гэтая вайна пачнецца, гэта ясна відаць з прапэсу „прампартыі“, з канфліктаў на мяжы, якія правакуюцца імпэрыялістамі.

Таварышы, ахоўваючы чырвоную мяжу, мы цьвёрда стаім, мы ведзем, якую вялікую пралетарскую дзяржаву мы ахоўваем, і нашы рады непахісныя (воплескі).

Акрамя сваёй непасрэднай працы па ахове мяжы, мы ўдзельнічаем ва ўсёй правадзімай партыяй і савецкай уладай рабоце ў вакольных вёсках. Працоўнае насельніцтва нам дапамагае ў справе аховы меж, у справе нагляданьня яе недатычнасьці для нашых ворагаў.

П аноўныя Савецкага Саюзу з усёй глыбінёй разумеюць значэньне прымежнай аховы і унутраных войск АДПУ. Кожны год зварочваецца увага на работу сярод гэтых войск, на ўзьнят це культурна-палітычнага ўзроўню гэтых войск. Але, таварышы, усё такі мы лічым, што X зьезд саветаў Беларусі займецца пытаньнем павышэньня нашага культурнага ўзроўню, асабліва трэба зьвярнуць увагу на удаўніцтва клюбаў і ленінскіх куткоў, якіх, бязумоўна, зусім недастаткова для правядзеньня адпаведнай культурна палітычнай працы.

Таварышы! Наша работа, наша вучоба і наша служба пранізаны насквозь сацспаборніцтвам, хваля рацыяналізатарскай работы, хваля рацыяналізатарскай мысьлі чырвонаармейца займае вялікае месца. Пагранічнікі ўсе сілы свае аддадуць на ахову нашых межаў.

Мне даручылі нашы пагранічнікі і ўнутраная вайска АДПУ заверыць X зьезд саветаў БССР што ахова, меж ў пралетарскай краіны ў верных, надзейных руках (гучныя воплескі).

Унутраная вайска АДПУ і прымежная ахова не дадуць ніводнаму гаду, ніводнаму мярзавцу зрываць нашае сацыялістычнае будаўніцтва як унутры краіны, так і з-за мяжы (гучныя воплескі).

Няхай жыве X зьезд саветаў БССР!

Няхай жыве кампартыя, яе ленінскі ЦК і наведны т. Сталін! (Гучныя воплескі і інтэрнацыянал).

Няхай жыве Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія! (Воплескі).

Голас з месца: Няхай жыве АДПУ—верны вартавы пралетарскай дыктатуры—ура! (крыкі—ура...)

(Голасы з месца—няхай жывуць слаўныя в чні вялікага настаўніка—Дзяржынскага ура... Гучнае ура, пераходзячыя ў авацыю).

Лыжнікі вітаюць зьезд Саветаў.

Гаспадару Савецкай Беларусі—X усебеларускаму зьезду саветаў

ад камунараў інтэрнацыянальнай камуны „Праца“, атрымаўшай пераходную прэмію ад ураду БССР,—шчырае камуністычнае прывітаньне

Наша камуна ў 1930 годзе, у дзень ураджаю, у выніку арганізаванага газэтай „Савецкая Беларусь“ конкурсу на лепшы калгас, за сваячасовае скончаньне веснавой пасеўнай кампаніі, пашырэньне пасеўнай плошчы, правядзеньне аграмінімуму, вырашэньне праблемы жывёлагадоўлі, падняцьце ўраджайнасьці, сваячасовае скончаньне ўборачнай кампаніі, разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, атрымала ад ЦВК БССР пераходную прэмію—штандар і трактар.

Да моманту атрыманьня прэміі камуна складалася з 72 членаў, з якіх беларусаў—28 чалавек, украінцаў—19 чал., палякаў—10, латышоў—7, [illegible]—2, немцаў—2 і пахаў—1. Камуна вясной засеяла 160 га яравога кліну, павялічыўшы пасеў плошчы супроць мінулага году на 300 проц. У выніку праведзенага аграмінімуму мы дабіліся вялікага ўраджаю.

У той час, як на вакольных палёх аднаасобнікаў ураджай жыта быў 0,75 тоны з га, у нас 1,65 тоны, бульбы ў аднаасобнікаў 7,5 тоны, у нас 21,65 тоны, аўсу ў аднаасобнікаў 0,9 тоны, у нас 1,65. Калі ў аднаасобнікаў і на ват вакольных калгасаў уся гародніна ў гэтым годзе была зьнішчана гусеніцай, па палёх камуны вырасла капуста ў 10 кілёграм качан і буракі ў 9 кілёграм. Дзякуючы такому ўраджаю мы здалі дзяржаве 45 тон капусты, 5 тон гуркоў, 0,65 тоны табаку і закантрактавалі для другіх калгасаў 16,5 тоны насенных буракоў. Плян хлебазагатовак выканан на 130 проц (здана 45 тон жыта).

Такім чынам мы на справе паказалі пераважнасьць камуны, як вышэйшай формы буйнай калгаснай гаспадаркі.

Пры разьмеркаваньні ўраджаю кожны камунар атрымаў у пераводзе на грошы прадукцыі ў сярэднім на 2 р. 25 кап за працоўны дзень. Наша камуна зьяўляецца асяродзьдзем калгаснага руху ў раёне, дзе процант калектывізацыі падняўся за апошнія два месяцы з 14 да 24. Камуна карыстаецца аўтарытэтам сярод працоўнага сялянства і расьце за лік новых членаў з батрацтва і беднаты. Яшчэ я так даўно прырост камуны зьяўляўся слабым месцам. Зараз дзякуючы праведзенай савецкай эстафэце (арганізаванай „Савецкай Беларуссю“) мы маем прыліў 49 членаў.

У тупаючы ў трэці рашаючы год пяцігодкі, камуна мае 210 галоў рагатае жывёлы—павялічыўшы статак супроць мінулага году ў 6 разоў, 500 шт. ангельскіх сьвіней і іо кшырскай пароды, супроць 50 шт. у мінулым годзе. Плян мясазагатовак перавыкананы. Здана дзяржаве 0,9 тоны сала і 1 тона сьвініны. Камуна паступова становіцца фабрыкай мяса.

Разам з ростам гаспадарчага і матэрыяльнага дабрабыту камунараў расьце і іх культурны ўзровень. У камуне ёсьць клюб, дзіцячыя ясьлі, свая школа і ліквпункт. У ліквпунце ліквідуюць сваю няпісьменнасьць апошнія 16 чал.—жанчыны.

Усе камунары добра разумеюць задачы партыі па правядзеньні другой большавіцкай вясны. Сустрэчным плянам, распрацаваным камунарамі, заданьне РВК па пасеўкампаніі павялічана на 10 проц. Насеньне цалкам адсартавана. Частка ўгнаеньня ўжо пер везена. Інвэнтар адрамантаваны на 100 проц. і цалкам гатовы да вясны. Сталёвы конь, які зьяўляецца гэнаровай прэміяй, атрыманай ад ЦВК БССР, добра падкаваны, змазаны і гатоў да таго, каб у моцных руках камунараў вясной драць дзедаўскія межы вакольных аднаасобнікаў, ламаць праз палосіну, змагацца за суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю на яе аснове кулацтва, як клясы.

Уся праца ў камуне вядзецца па ўдарнаму і на аснове самай шчыльнай брацкай сувязі паміж камунарамі розных нацыянальнасьцяй, складаючых камуну. Нацыянальнае пытаньне ў нас вырашана па Ленінску, што дае нам права называцца сапраўды інтэрнацыянальнай камунай. Выконваючы сваю працу камуна адначасова ўдзельнічае і ў ліквідацыі.

За гэты час намі вывезена 800 м/дроў, а 16/II у адзнаку адкрыцьця вашага зьезду адпрацавалі суботнік, грошы з якога пашлі на пабудову дырыжабля „Клім Варашылаў“. Ва ўсім раёнё суботнік прайшоў з вялікім уздымам, што дало магчымасьць выканаць квартальны плян па вырубцы стройматэрыялаў на 72 проц. і вывазцы дроў—на 68 проц.

Мы павышэм свае ваенныя веды ў гуртку Асаавіяхэму памятуючы аб тым, што кожны атрад камунараў—атрад пралетарскіх байцоў за сусьветную камуну!

Асноўным недахопам нашай працы зьяўляецца тое, што мы не пасьпяваем з будаўніцтвамі за шпаркім ростам нашае гаспадаркі. Нам трэба яшчэ пабудаваць сьвінарнік на 400 галоў, стайню, скотны двор і два жыльлёвых будынкі. Але мы завяраем X зьезд саветаў, што і гэтыя недахопы ў трэцім годзе пяцігодкі будуць намі пераможаны.

Мы таксама завяраем зьезд, што, атрыманая прэмія знаходзіцца ў моцных руках камунараў. Мы будзем біцца за тое, каб штандар і трактар ня выпусьціць са сваёй камуны і далейшымі посьпехамі ў развіцьці камуны дакажам ураду БССР, што мы гэтай прэміі варты, як лепшы калгас Савецкай Беларусі!

Няхай жыве і шырэй разгортваецца калгасны рух у нашай краіне!

Нахай жыве камуністычная партыя, пад кіраўніцтвам якой мы змагаемся за сусьветную камуну!

Няхай жыве ленінізм і вытрымаць вучань Леніна і правадыр нашай партыі тав. Сталін!

На даручэньні камунараў старшыня камуны Пашкевіч

Сэкратар ячэйкі КП(б)Б
Палявод камуны Аксючыц

На шляху „Савецкай эстафэты“ РАЁНЫ РАПАРТУЮЦЬ

Рапартуюць Жыткавічы

Гаспадару БССР — X Усебеларускаму Зьезду Саветаў братэрскае пралетарскае прывітаньне.

Жыткавіцкі раён пад кіраўніцтвам Ленінскай камуністычнай партыі і дапамозе мясцовых камсамольскіх, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый дасягнуў наступных посьпехаў:

На 20-е лютага г. г. у раёне калектывізавана 1250 гаспадарак ці 35 проц. да агульнай колькасьці двароў.

Плян вясеньняга севу, дадзены Нарканземам БССР у 8.048 га, пашыраны Райвыканкомам на 11 проц.

Хлебазагатоўкі выкананы на 135 пр. гадавога пляну.

Па становішчу на 20-е лютага г. г. аднаразовага збору сабрана 70 проц. заданьня.

Сеназагатоўкі выкананы на 85 проц.

Мясазагатоўкі квартальнага пляну выкананы на 65 проц.

Усеагульным абавязковым навучаньнем ў раёне ахоплена 96 проц. дзяцей школьнага ўзросту.

Побач з дасягненьнямі раён мае і значныя недахопы: слаба праходзіць мабілізацыя сродкаў, асабліва ў дабра ахвотным парадку; слаба праходзяць лесазагатоўкі, лесазагатоўкі і лесавывазкі.

Прэзыдыум Райвыканкому сумесна з старшынямі сельсаветаў, райактывам і спэцыялістамі ў падарунак X Усебеларускаму Зьезду Саветаў 17-га лютага г. г. абвясьціў дэкаду штурму па ліквідацыі прарываў, абавязуючыся на працягу працы X Усебеларускага Зьезду Саветаў выканаць наступныя абавязацельствы:

Да 5-га сакавіка г. г. поўнасьцю выканаць квартальны плян па мабілізацыі сродкаў,

Скласьці па ўсіх калгасах вытворчыя пляны.

Скончыць лёназагатоўкі, выканаўшы з перавышэньнем плянавыя заданьні.

Сабраць насенны фонд і стварыць страхавыя фонды, як у калгасах так і па індывідуальным сэктары.

Пасіліць загатоўкі і вывазку лесматэрыялаў.

Для ліквідацыі паказанага прарыву створаны 9 брыгад з райактыву і спэцыялістаў раёну ў колькасьці 33 асоб.

Няхай жыве камуністычная партыя—кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве X Усебеларускі Зьезд Саветаў.

Па даручэньні нарады.

Старшыня Жыткавіцкага РВК Рашал.

Дабіліся значнага пералому

Жыткавіцкі раён

У Савецкую эстафэту Жыткавіцкая Раённая Выбарчая Камісія ўключылася 7-га сьнежня 1930 г. Па ўсіх сельсаветах было арганізавана 9 брыгад з удзелам 27 чалавек высокага актыву. Брыгады па сельсаветах праводзілі работу ў напрамку выкананьня маршрутаў Савецкай эстафэты, пратанованых газэтай «Савецкая Беларусь».

У час правядзеньня Савецкай эстафэты брыгады ставілі сваёй мэтай павярнуць работу сельсаветаў тварам да калгасаў і саўгасаў, даючы на мясцох практычныя паказаньні ў рабоце працаўнікам сельсаветаў. Адначасова з гэтым зварочвалася дастаткова ўвага на выкананьне палітычна-гаспадарчых кампаній (розныя віды загатовак, мабілізацыя сродак і інш.) у выніку чаго некаторыя віды палітычна-гаспадарчых кампаній, як хлебазагатоўкі, бульбазагатоўкі і г. д. па раёне выкананы і перавыкананы.

За час правядзеньня Савецкай эстафэты ў раёне арганізавана 3 калгасы, у якія ўвайшло 36 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а таксама ўступіла ў старыя калгасы 39 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Нам. старшыні РВК Квятняк.

Па бальшавіцку у бой за ауладаньне тэхнікай

ЗА якасьць прадукцыі, зьніжэньне сабекошту, поўнае выкананьне прамфінпляну

Кожная ўдарная брыгада, кожны ўдарнік па аўладаньні тэхнікай, павінны стаць брыгадай, вартай імя правадыра партыі т. Сталіна

У адказ на агідную хлусьню капіталістаў аб „прымусовай працы" ў СССР ударнікі Менску арганізуюць усебеларускі суботнік

Мясцовая прамысловасьць БССР і яе задачы ў трэцім рашаючым

Шпаркія тэмпы разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР за мінулыя два гады пяцігодкі, працякаўшыя пры бурным узросьце прамысловасьці як Усесаюзнага, так і рэспубліканскага значэньня абумовілі далейшыя шляхі значнага разгортваньня і мясцовай прамысловасьці, якая падпарадкавана Выканаўчым Камітэтам і Гарсаветам.

Ход выкананьня пяцігодкі за першыя два гады паказвае, што ўзятыя тэмпы разгортваньня мясцовай прамысловасьці забясьпечваюць выкананьне пяцігодкі ня толькі ў чатыры гады, а дазваляюць амаль па ўсіх галінах прамысловасьці выканаць заданьне па пяцігадовым пляне ў 3 гады, а па асобных галінах (дрэваапрацоўка, мэталяапрацоўка) ужо ў 1929-30 г. дасягнута перавышэньне пяцігодкі ў сярэднім на 60 проц.

Мясцовая прамысловасьць якая была раней падпарадкавана Акруговым Выканаўчым Камітэтам, з ліквідацыяй акруг засталася ў поўным ведамі РВК і Гарсаветаў; Гэты пераход пакінуў за сабой адпаведныя зьмены ў плянаваньні і рэгуляваньні асобных прадпрыемстваў мясцовага значэньня. Замест ранейшых акруговых інспекцый мясцовай прамысловасьці, з ліквідацыяй акруг і застаўленьнем ў БССР тэрытарыяльнага падзяленьня на раёнах, справа кіраваньня мясцовай прамысловасьцю ўскладзена непасрэдна на РВК і Гарсаветы, у складзе якіх утвораны спэцыяльныя плянавыя часткі.

Максымальна скарыстаць прамысловыя магчымасьці

Сучаснае становішча справы плянаваньня мясцовай прамысловасьці, у сувязі з перадачай гэтых функцый непасрэдна РВК і Гарсаветам, значна адстае ад сапраўдных патрэб, і тэмпаў разьвіцьця мясцовай прамысловасьці, усё гэта патрабуе рашучай перабудовы ў рабоце РВК і Гарсаветаў па лініі плянаваньня і рэгуляваньня мясцовай прамысловасьці, а таксама ўтварэньня найбольш, спрыяючых умоў працы падпарадкаваных ім прадпрыемстваў і максымальнага скарыстаньня прамысловых магчымасьцяй раёну па шляху далейшага індустрыяльнага разьвіцьця апошняга ў адпаведнасьці з мясцовымі сыравінымі рэсурсамі. Разьвіцьцё мясцовай прамысловасьці за першыя два гады пяцігодкі ў параўнаньні з 27-28 г., і з пяцігадовым плянам характарызуецца наступнымі паказьнікамі:

НАЗВА ГАЛІН ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ	Валавая прадукцыя па цэнах 26-27 г.					
	1928-1929 г.	У %% да		1929 г. 1930 г.	У %% да	
		1927-928 г.	1-га году 5 год.		1928 г. 1929 г.	32/33 г. паб-ці год ы
1. Здабыча і апрацоўка мінер.	2093,9	163,7	119,3	4208	201	65,4
У т. л. цэгельн. вытворчасьць	1568,7	147,8	88,1	3456	220,3	103,1
2. Тарфяная	32,9	—	—	402	—	—
3. Мэталяапрацоўчая	494,6	167,7	67,1	2204	445,6	132,0
4. Дрэваапрацоўчая	4499,6	1 2,3	125,3	6405	1 2,3	144,3
У т. л. лесапільня	3498,	132,9	—	3478	99,4	—
5. Харчасмакавая	3809,9	132,7	123,1	5241	137,6	39,1
У тым ліку: млынарная	1236,9	122,2	82,5	2245	181,5	80,1
6. Хімічная	582,2	228,2	175,8	694	119,2	77,0
7. Скурана-абутковая	995 9	62,4	36,5	3041	30 ,3	705,8
8 Тэкстыльная	1660 2	—	370,5	2708	163,1	115,9
9. Паліграфічная	1017,1	148 7	164,1	2239	213 8	311,9
УСЯГО	15216 3	145.5	134,4	27142	178,4	80,6

УВАГА Лічбы 29-30 г. прыведзены з намёткі на 1931 г.

Прыведзеная табліца паказвае значнае павялічэньне мясцовай прамысловасьці за мінулыя два гады, вызначыўшае прырост агульнай валавой прадукцыі на 29-30 г. на 78,3 супроць 28-29 г. і на 160,6 супроць 27-28 году ды ўжо ў абсалютных вялічынях 27,1 міл. руб., замест 15.2 міл. р., у 28-29 г. і 10,4 міл. руб. у 27-28 г.

Па асобных галінах прамысловасьці павялічэньне аб'ёму прадукцыі супроць 27-28 г. асабліва шпарка працякае на керамічнай—на 229,2 проц. (з 1278,3 тыс. руб. да 4208 тыс. руб.), па мэталяапрацоўчай — на 647,1 проц. (з 295,2 тыс. руб. да 2204 тыс. руб.), па дрэваапрацоўчай — на 88,3 проц. (з 3 02,4 тыс. руб. да 6405 тыс. руб.), па харчасмакавай — на 82,4 проц. (з 2872 тыс. руб., да 5241 тыс. руб.), тэкстыльнай — (з 43,5 тыс. руб. да 2708 тыс. руб.).

Здабыча торфу, павялічыўшыся да 402 тыс. руб. замест 240,9 тыс. руб. у 1927-28 г., усе-ж разгортваецца недастатковымі тэмпамі, і ў той час калі БССР багата тарфянымі масывамі і сыравінамі магчымасьцямі. Гэтыя марудныя тэмпы здабычы торфу тлумачацца дрэнным забясьпечаньнем торфараспрацовак неабходным абсталяваньнем і недастатковай увагай з боку мясцовых органаў да максымальнага форсіраваньня торфараспрацовак.

Па керамічнай прамысловасьці, у асноўным, рост прадукцыі працякае на лініі вытворчасьці цэглы, як звычайнай і сылікатнай, што дасягнута галоўным чынам, у выніку ўвядзеньня ў экспляатацыю ўжо пабудованых цагельных заводаў з печамі магутнасьцю 6-7 міл. шт. а таксама пускам у ход Клімавіцкага сылікатнага заводу (выпуск у 29-30 г. 8,5 мія. шт.). Пры заметным разгортваньні цагельнай вытворчасьці, выраб іншых будматар'ялаў, як чарапіца, ванна, клінкер, па ранейшаму працякае нездавальняюча. Павялічэньне прадукцыі па мэталяапрацоўчай прамысловасьці праходзіць у асноўным за лік большага разгортваньня сеці сельска-гаспадарчых рамонтных майстэрняў і далейшага дазбсталяваньня і прыстасаваньня існуючых мэталязаводаў да максымальнага абслугоўваньня патрэб сельскай гаспадаркі ў адпаведнасьці з сацыялістычнай яе перабудовай. Апроч гэтага па мэталязаводзе Барысаўскага Гаркамбінату арганізавана новая вытворчасьць па выпуску тэрмасаў для патрэб грамадзкага харчаваньня.

Рост па дрэваапрацоўчай вытворчасьці працякаў па лініі пашырэньня вырабаў (мэблі, унітазных сядзеньняў і інш.), а таксама разгортваньня сталярных майстэрняў за лік замаруджаньня лесапільня.

Харчасмакавая прамысловасьць адзначыла далейшае разьвіцьцё ў асноўным за кошт разгортваньня млынарнай вытворчасьці і асабліва цукеркавай, Дзяржхарчпром і Нараўлянская кукерачная фабрыка) пры адначасовым спыненьні выпуску махоркі (Менск і Бабруйск) і піва ў Гомлі (піваварны завод—Спартак»).

Па тэкстыльнай прамысловасьці значны рост прадукцыі зьвязан з пераходам да мясцовай прамысловасьці прадпрыемстваў (Менская Лямцавая вяровачная ф-ка, Менская Трыкатажная ф-ка, «Чыр-Тэкстыльшчык» і інш.) якія раней знаходзіліся пад загадам НКПрацы (быўш. працкалектываў).

Шпаркі рост мясцовай прамысловасьці патрабаваў карэннага зьмяненьня ў усяго прамысловага балянсу, у якім, у параўнаньні з 1927-28 г., асабліва павялічэньне ўдзельнай вагі адзначыў 1929-30 г. па лініі керамічнай (з 12,2 проц. да 15,5 проц.; мэталяапрацоўчай (з 2,8 проц. да 8,1 проц.) і тэкстыльнай (з 0,4 проц. да 10 проц.) галін прамысловасьці. У той час, наладзецца падзеньне ролі ў агульнай прамысловай прадукцыі дрэваапрацоўчай (з 32,5 проц. да 23,6 проц.) і харчасмакавай (з 27,5 проц. да 19,3 проц.) прамысловасьці.

Памяншэньне ўдзельнай вагі па дрэваапрацоўчай прамысловасьці, складаўшай у 27-28 г. каля 1/3 усёй прадукцыі мясцовай прамысловасьці, знаходзіцца ў простай залежнасьці ад скарачэньня лесапільня, абумоўленага працэсам канцэнтрацыі гэтай вытворчасьці на тэхнічна-лепш абсталяваных прадпрыемствах Лесбелу. Пасьпяховае разгортваньне мясцовай прамысловасьці за апошнія 2 гады працякала ва ўмовах значнага ўцягненьня ў вытворчасьць рабсілы дасягнуўшай ў 29-30 г. 7321 чал. замест 4632 чал. у 1928-29 г. што дае ўзрост на 96,2 пр.

Капітальнае будаўніцтва штогод павялічваецца

Разьмер капітальных укладаньняў за апошнія два гады характарызуецца наступнай табліцай (у тыс. руб.):

	27-28 г.	28-29 г.	29-30 г	Асобны квартал 1930 г.
Капітальныя работы	1895,5	3128	9485	2370
У проц. да мінулага году	10 %	164,9	303,5	—

Прыведзеныя лічбы паказваюць, што тэмпы разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва мясцовай прамысловасьці штогод павялічваюцца і перавышаюць тэмпы, узятыя па агульна рэспубліканскай прамысловасьці, а ў 29-30 г. перавысілі запраектаваныя наметкі 32-33 г. па пяцігоды на 60,3 проц.

Асаблівы ўзрост капітальных работ адзначаецца па лініі здабычы і апрацоўкі мінэралаў (5111 тыс. супроць 1521 тыс. у 28-29 г. і 495,1 тыс. у 27-28 г.), торфараспрацовак (490 тыс. замест 71 тыс. у 28-29 г. і 86,2 тыс. у 27-28 г.) і мэталяапрацоўчай (628 тыс. супроць 1278 тыс. у 28-29 г. і 106,1 тыс. у 27-28 г.), дрэваапрацоўчай (656 тыс. замест 236 тыс. у 28-29—2021,6 тыс. у 27-28 г.), харчасмакавай (1931, тыс. супроць 937 тыс. у 28-29 г. і 839,7 тыс. у 27-28 г.) і тэкстыльнай (347 тыс. супроць 87 тыс. у 28-29 г. і 90,38 тыс. у 27-28 г.) галінах прамысловасьці. Паказаныя лічбы росту капіталаўкладаньняў па ўсіх галінах мясцовай прамысловасьці сьведчаць аб тым, што пераважная частка капітальных работ падае на здабычу і апрацоўку мінэралаў, разьмер якіх (капітальных работ) склаў у 29-30 г. 5111 тыс. руб. замест 495,1 т. р. у 27-28 і 1521 т. р. у 28-29 г. Пры гэтым капітальныя работы прыходзяцца ў асноўным на цагельную вытворчасьць, укладаньні ў якую дасягнулі 3761 т. р. супроць 275 т. р. у 27-28 г. і 1334 т. р. у 28-29 г.

Па харчасмакавой прамысловасьці капітальныя работы накіраваны галоўным чынам па лініі кандытэрскай і крухмальнай вытворчасьці пры адначасовым памяншэньні ўкладаньняў па млынарнай вытворчасьці, у сувязі з перадачай млынаў Саюзхлебу.

Укладаньні па скуранай вытворчасьці (195 т. р. замест 87 тыс. руб. у 28-29 г. і 21,4 тыс. у 27-28 (зьвязаны з пераабсталяваньнем Менскай рымарнай ф-кі) б. Працкалектыў) на скурана-галянтэрэйную вытворчасьць.

Па тэкстыльнай прамысловасьці капітальныя ўкладаньні працякаюць галоўным чынам па Менскай лямцавай вяровачнай ф-цы і выкліканы канцэнтрацыяй вытворчасьці лямцавых вяровак на аднэй тэрыторыі, і арганізацыяй новай мэханізаванай вытворчасьці валёнак.

Адзначаючы пасьпяховае разгортваньне будаўніцтва па мясцовай прамысловасьці трэба канстатаваць і мачоныя недахопы на лініі капіталаўкладаньняў, галоўнымі з якіх зьяўляецца недастатковая, па шэрагу прадпрыемстваў, загружанасьць асноўнога капіталу, што ў значнай ступені паніжае намечаную эфэктыўнасьць утвораных капіталаўкладаньняў. Асабліва недапушчальнымі зьяўляюцца выпадкі па прадпрыемствах, якія базуюцца на мясцовай сыравіне, да ліку якіх адносіцца керамічная прамысловасьць: пры значных капітальных работах утвораных ужо у 28-29 г. і яшчэ больш у 29-30 г. плян вырабу сырца і выпуску цэглы за 29-30 г. выкананы у сярэднім на 70 проц., а па асобных прадпрыемствах прарыў у выкананьні прамфінпляну дасягнуў разьмеру ў 50-55 проц. (Віцебск, Гомель, Полацк).

Гэткае-ж становішча наглядаецца і па відах будматар'ялаў (чарапіца, клінкер, ванна, гожта і г. д.) гэта ўсё абавязвае РВК і Гарсаветы, зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўмацненьне работы, на поўнае скарыстаньне сваіх асноўных капіталаў на гэтай прамысловасьці.

Што-ж да геаграфічнага разьмяшчэньня асобных прадпрыемстваў дык у асноўным мясцовая прамысловасьць канцэнтруецца у б. акруговых цэнтрах і гарадох БССР. Трэба адзначыць, што ў параўнаньні з мінулымі гадамі маецца пэўны зрух па разгортваньні мясцовай прамысловасьці, асабліва гэты зрух наглядаецца ў 29-30 г. па шэрагу раёнаў (Любаньскі, Пятрыкоўскі, Рэчыцкі, Засьпенскі Крухмальны з-д, Тураўскі і інш.). Побач з гэтым маецца шэраг і адсталых раёнаў у якіх амаль адсутнічае непасрэдна падпарадкаваная РВК мясцовая прамысловасьць (Клічаўскі Лёзьнянскі, Расьнянскі, Межанскі, Чашніцкі, Буда-Кашалёўскі, Уваравіцкі Хойніцкі, Прапойскі, Азарыцкі, Жытковіцкі, Капаткевіцкі і інш.). Гэта сьведчыць аб адсутнасьці дастатковага эканамічнага вывучэньня прыродных ўмоў з баку асобных раёнаў.

План пяцігодкі мясцовай прамысловасьці магчыма выканаць у 3—3½ гады

Факт значнага перавыкананьня па лініі мясцовай прамысловасьці намётак пяцігодкі за першыя 2 гады абумовіў перспэктывы далейшага разьвіцьця. У адпаведнасьці з дырэктывамі, Сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), і рашэньнем 3-й сэсіі ЦВК БССР трэці рашаючы год пяцігодкі павінен даць новы ўздым узросту ва ўсіх галінах гаспадарчага разьвіцьця, павінен зьвяціца годам больш хуткага прасоўваньня ўперад у стварэньні новай тэхнічнай базы народнай гаспадаркі. План 1931 па мясцовай прамысловасьці БССР забясьпечвае па шэрагу галін выкананьне пяцігодкі ў 3-3½ гады і накіраван да поўнага скарыстаньня мясцовых сыравінных рэсурсаў і прыродных багацьцяў, кожнага раёну паасобку. План 1931 г. па мясцовай прамысловасьці характарызуецца наступнымі паказьнікамі:

1. Аб'ём валавой прадукцыі (па цэнах 26-27 г.) запраектаваны ў разьмеры 69 міл., замест 27,1 міл. руб. у 29-30 г., што складае павялічэньне на 42 міл. руб., альбо на 155,5 проц., Запраектаваны ўзрост прадукцыі больш чым удвая перавышае наметкі 32-33 г. (33,5 міл. руб.) па пяцігодцы.

По асобных галінах работ найбольш буйны прырост прадукцыі, ў параўнаньні з 1929-30 годам, вызначаны па керамічнай—на 16,2 проц.) 8518,5 тыс. супроць 3939 тыс. у 29-30 г.) па тарфяной на 433,1 проц. (588,6 тыс. замест 110,4 тыс.), па мэталяапрацоўчай —на 269,3 проц. (3734,6 тыс. замест 1010,7 тыс.), па дрэваапрацоўчай — на 93,1 проц. (13172 тыс. супроць 6820,3 тыс.), па харчасмакавай — на 268,4 проц. (22781,8 тыс. замест 6411,5 тыс. руб.), па хімічнай — на 252,8 проц. (6183,9 т. супроць 1752,7 тыс. руб.) і скурана-абутковай — на 181 проц.) 9452 тыс. супроць 3140 тыс.

Колькасьць рабочых павялічваецца да 8241 чал. сталых і 7651 чал. сэзонных супроць 5152 чал. і 3279 у 29-30 г. на 48,5 проц. і 134 проц.

Капітальныя ўкладаньні на 1931 г. запраектаваны ў разьмеры 11,5 міл. р. замест 9,5 міл. (па прамфінпляну) у 29-30 г. і 5918 тыс. у 32-33 г. па пяцігодцы. Такім чынам і па лініі капітальных работ плян 1931 г. характарызуецца значным перавышэньнем пяцігадовага пляну.

Капітальныя работы 1931 г. накіраваны на скančэньне пачатага ўжо ў 1930 г. будаўніцтву па керамічнай, харчымакавай (Гомсельхорчпром), тэкстыльнай (Менская Лямцава-вяровачная ф-ка), скуранай (Менская скурана галянтэрэйная ф-ка) і іншых галінах прамысловасьці падпарадкаваных РВК і Гарсаветам.

Новае будаўніцтва намечана выключна па цагельнай і чарапічнай вытворчасьцях, на якіх у паасобных раёнах мяркуецца пабудаваць да 50 касэльных і канальных печэй, а таксама некалькі чарапічных заводаў. У асноўным укладаньні па цагельнай вытворчасьці ўтвараюцца па лініі мэханізацыі і рэканструкцыі існуючых і пачатых будаўніцтвам цагельных заводаў з тым, каб забясьпечыць запраектаваны выраб цэглы ў 1931 г. (звыш. 200 міль шт.), Сярод іншых затрат, зьвяртае ў вачу пабудова парфумакасмэтычнай ф-кі ў Гомлі, па якой намечана выдаткаваньне выключна на мэханізацыю 150 тыс. руб. з выпускам прадукцыі на суму 6 міл. руб. (па цэнах 26-27 г.), а таксама скančэньне будаўніцтва скурана-галянтэрэйнай ф-кі ў Менску, разьлічанай на выпуск прадукцыі да 9 міл. руб.

Фінансавы плян праектуемы на 1931 г. па мясцовай прамысловасьці характарызуецца наступнымі лічбамі:

1. Капітальныя работы—11.500 тыс.
2. У тым ліку на дасьледчые праектавальные работы 150.000 тыс.
3. Пакрыцьцё за пажыцьнасьці па капітальным работам мінулых гадоў 1.007 тыс.
4. Зварот пазык 84.000 тыс.
5. Адлічэньне прыбыткаў у мясцовы бюджэт 8.060 тыс.
6. Іншыя «фубр і гэтых далей 1.017 тыс.
7. Прырост зваротных фондкаў 2.704 тыс.

Усяго 24.372 тыс.

Плян 1931 года павінен яшчэ больш забясьпечыць абароназдольнасьць краіны. Ажыцьцяўленьне пастаўленых задач перад мясцовай прамысловасьцю ў 1931 г. патрабуе вялізарнага разгортваньня ініцыятывы ўстіх работнікаў прамысловых прадпрыемстваў мясцовага значэньня сапраўднага і рашучага павароту РВК і Гарсаветаў, тварам да вытворчасьці ў адпаведнасьці з тым зрухам і пераломам, якія адбыўся ў часе перавыбараў выканаўчых камітэтаў і гарадзкіх саветаў.

Ажыцьцяўленьне задач 3-га году пяцігодкі ад мясцовай прамысловасьці патрабуе настойлівай і разгорнутай барацьбы за жаксныя паказьнікі.

Выкананьне пляну 1931 г. па мясцовай прамысловасьці патрабуе, вялікай ініцыятывы з боку ўсіх работнікаў мясцовай прамысловасьці павышэньня адказнасьці і чоткасьці ў рабоце, поўнага і цьвёрдага правядзеньня ў жыцьцё разнаначальля ва ўсіх зьвеньнях работы.

Задачы тэхнічнага кіраўніцтва прамысловасьці набываюць выключна важнае значэньне ў сучасны момант у час вялізарнага разгортваньня капітальных работ і карэнной перабудовы тэхнічных асноў усёй прамысловасьці. У адпаведнасьці з гэтым неабходзен рашучы зрух і па лініі мясцовай прамысловасьці ў напрамку перабудовы ўсёй работы. Далейшае «кіраўніцтва наогул», кіраўніцтва без ведаў тэхнічнага і фінансава-эканамічнага боку становіцца немагчымым і зводзіць кіраваньне да падпісаньня толькі папер.

Плян 1931 г. высоўвае перад мясцовай прамысловасьцю новыя вялікія задачы, асваеньне і пасьпяховае выкананьне якіх павінны даць далейшы зрух у сацыялістычным будаўніцтве. Выканаўчым Камітэтам і Гарсаветам неабходна безадкладна перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і з тым плянам які вызначаны ў 1931 годзе.

З боку ВСНГБ і асобных яго аб'яднаньняў павінна ўдзяляцца вялікая ўвага запатрабаваньням мясцовай прамысловасьці асабліва па лініі тэхнічнай дапамогі і кансультацыі, а таксама ў галіне плянаваньня і рэгуляваньня, увязкі з тэмпамі разгортваньня агульна рэспубліканскай прамысловасьці. На базе максымальнага разгортваньня сацыякаборніцтва і ўдарніцтва пры актыўным удзеле ўсёй рабочай масы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі забясьпечым ня толькі выкананьне, але і перавыкананьне намечаных кантрольных лічбаў на 1931 г. па мясцовай прамысловасьці.

С. Гольберг.

Знойдзем вышэйшыя формы сацыялістычнае працы

22-га лютага г.г. увечары пачала сваю работу канфэрэнцыя скразных ударных брыгад прадпрыемств гор. Менска. Дэлегаты канфэрэнцыі заслухалі даклад тав. Адама аб месячніку паходу ва ўзмацненьне і далейшае разгортваньне сацыялістычнай формы працы. Дакладчык у сваім дакладзе зазначыў, што дзякуючы актыўнасьці і энтузіязму рабочай клясы па шэрагу прадпрыемстваў БССР прамфінплян ня толькі выконваецца, але і перавыконваецца. Вышэйшыя формы працы арганізацыя ўдарных брыгад, скразных брыгад на прадпрыемствах дае лепшае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну і зьніжэньне сабекошту. Так, калі на завод «Пролетары» (Гомель) да арганізацыі скразной брыгады завод выпускаў 35-37 раствора-мешалак—на што патрабавалася 74 працоўныя дні, дык зараз, калі арганізавалася скразная ўдарная брыгада завод выпускае 100 раствора-мешалак, на што патрабуецца ўсяго 22 працоўных дні.

По 33 прадпрыемствах БССР 65 проц. рабочых ахоплены ўдарніцтвам; на гэтых прадпрыемствах арганізавана 51 скразная ўдарная брыгада, 110 вытворчых камун і 40 проц. рабочых заматавана да канца пяцігодкі, хоць значная колькасьць рабочых перайшла да вышэйшых форм працы, але-ж за ступдзень месяц выкананьне прамфінпляну прымушае біць трывогу, асабіста па мэталяапрацоўчай, запалкавай і інш. прамысловасьцях, вось таму ЦСПСБ і абвяшчае з 20-га лютага г. г. месячнік паходу за ўзмацненьне і далейшае разгортваньне і ўжываньне сацыялістычных форм працы.

Адміністрацыйны пэрсанал яшчэ нядбайна адносіцца да рабочага вынаходніцтва і каштоўных прапаноў, напрыклад, дырэктар заводу «Калпрада» 200 рабочых каштоўных прапаноў палажыў у архіў. Такія факты маюцца і яшчэ па шэрагу прадпрыемстваў.

У спрэчках выказаліся каля 25 чалавек.

Тав. Азарыцкі, завод „Бальшавік"

У сваёй прамове зазначыў, што завод «Бальшавік» хоць і мае дасягненьні, але-ж побач з гэтым ёсьць і вялікія недахопы. На заводзе ёсьць рвацтва, прагулы і шэраг іншых прыкрых зьяў-

Т. Глайхэнгаўз—майстар інструментальнага цэху «заводу Энэргія» ударнік

вішч, што тармозіць пасьпяховае выкананьне прамфінпляну. Гэтае становішча наглядаецца асабліва на ночных зьменах, але на жаль малую ўвагу зварочвае фабзаўком і інш. арганізацыі на ночныя зьмены. У ночных зьменах яіколі ня ўбачыш адміністрацыі, прафарганізатара, апрач міліцыянэра.

Тав. Раманаў, завод „Камунар"

Зазначыў, што на шэрагу прадпрыемств з боку фабзаўкомаў, парт'ячэек і інш. арганізацый няма кіраўніцтва скразнымі брыгадамі. Інжынэрна-тэхнічныя работнікі не ўцягнуты ў скарыстаньне рабочага вынаходніцтва і іх прапаноў.

Месячнік паходу павінен зрабіць зрух у ачыстцы заводаў, фабрык ад лятуноў, ад рвацтва і інш. шкодных элемэнтаў, якія перашкаджаюць выкананьню прамфінпляну.

У спрэчках выказаўся цэлы шэраг таварышоў, якія адзначалі, што з боку ЦСПСБ слабае кіраўніцтва ў скарыстаньні вышэйшых форм працы. ЦСПСБ назат да гэтага часу не пакланаціўся выпусьціць брашуры аб вышэйшых формах працы.

Пасьля спрэчак дэлегаты прынялі плян правядзеньня месячніка за выпусканьне вышэйшых форм і мэтадаў сацыялістычнае працы.

Дэлегаты вынесьлі пратэст супроць хлусьні капіталістых аб тым, што ў нас, у краіне разьвіцьця сацыялізму ўжываецца «прымусовая праца». У адказ на гэту хлусьню канфэрэнцыя скразных ударных брыгад гор. Менску пастанаўляе зрабіць Усебеларускі суботнік у дапамогу разьвіцьця нашага транспарту. Даручыць распрацаваць плян правядзеньня ЦСПСБ і зараз-жа яго распачаць.

Боўка М. Я.

Тав. Райка фабрыка „Акцябр"

Зазначае, што на ф-цы не разгорнута як належыць быць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, фабзаўком і адміністрацыйны пэрсанал чакаюць дырэктыў ад вышэйшых органаў. Тут трэба зазначыць, што маецца некаторая бязьдзейнасьць і з боку ЦСПСБ, бо калі мы паглядзімо як пераносіцца вышэйшыя формы працы з аднаго прадпрыемства на другое, дык можна сказаць, што тут ЦСПСБ бязьдзейнічае. Рабочыя з Барысава едуць у Менск на фабрыкі і на заводы, шукаюць вышэйшых форм працы ў той час, як гэта ЦСПСБ можа зрабіць пісьменна.

Рабочую сьмякалку на службу прамфінпляну

За апошнія гады вынаходзтва на чырвонаштандарным зав. «Бальшавік» заняло найвышэйшае месца ў выкананьні прамфінпляну і зьніжэньні сабекошту выпускаемай прадукцыі. За 1929-30 гаспад. год унесена 342 рацыяналізатарскія прапановы, якія далі эканомі 411 тыс. 355 р. За ўдарны квартал 30 году ўнесена 296 рабочых прапаноў, частка якіх ужо ажыцьцёўлена і дала эфэкт у 37 тыс. руб.

Плян рацыяналізацыі на 1931 г. прадугледжвае атрыманьне эканомі ў суме 331.556 руб. 22 кап.

У 1930 г. было прэміравана 31 чалавек на суму 2610 руб., у асобным квартале 23 чал. на суму 1426 руб. Рабочая сьмякалка расьце з кожным днём; тав. Станчык унёс да 10 рацыяналізатарскіх прапаноў.

Тав. Станчык за вынаходніцтва прэміраван некалькі разоў за зьмену мэтадалёгіі апрацоўкі каляровага лайку. Рабочыя Іванаў і Бацьвіньнік—ізьялі з пластыраванае машыны непатрэбныя 63 дэталі, што дало лепшае выжыманьне скуры, зьмяншэньне выдаткаў па электраэнэргіі, а таксама зьменшыла рамонты і прастоі машыны. Гэта вынаходніцадобрана кіраўніцтвам машына-будаўнічых заводаў «Ленінская кузьня» імя Арцёма ў Кіеве.

Рабочы Дубровіцкі прапанаваў пабудаваць аграджэньне да фольмашыны (Каток «Румер»). Прапанова Дубравіцката пераслана Віцебскаму скуразаводу, якім выдадзена прэмія ў 400 руб.

Т. Парандоўскі—токар ударнік «Заводу Энергіі» вытворчы стаж 28 год

На заводзе сыстэматычна праводзіцца шырокая папулярызацыя рацыяналізацыі, выдаюцца бюлетэні, склікаюцца агульна - заводзкія канфэрэнцыі абмеркаваньня рабочых прапаноў, створана фотавітрына, выстаўка і г. д.

Рабочыя прапановы даводзены да варштату мэтадам разьвешваньня зводак аб паступаючых рабочых прапановах і прымаемых па іх рашэньнях.

Недахоп скурсыравіны і вялікая патрэбнасьць у абутку, на сёньняшні дзень ставіць перад скурпрамысловасьцю задачу вынаходзтва штучнай скуры, асабліва вынаходзтва штучнай падашвы і іх сурагатаў.

Контус.

Рашуча ўзяцца за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў

Мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў і барацьба са стратамі на скуразаводзе «Бальшавік», паказала на тыя вялікія каштоўныя машынаабсталяваньні, якія ўсё яшчэ з-за мяжы, не скарыстоўваюцца на прадпрыемстве і застаюцца ляжаць на складах заводу мёртвым капіталам.

На заводзе «Бальшавік» была створана спэцыяльная камісія ў складзе гас падарніка навуковага працаўніка з ТНБ і рабочых заводу. Камісіяй адначасова зьбіраліся рабочыя прапановы ў гэтым напрамку.

Т. Рабіновіч—мадэльшчык заводу «Энергія» член [illegible]

Камісія знайшла магчымым рэалізаваць непатрэбныя заводу машынаабсталяваньні, якія ляжалі на складзе, а так сама і матар'ялы на суму 16.155 руб. Вялікая безгаспадарчасьць ёсьць на складах ВКО, дзе аказалася адных амэрыканскіх сьвярдлоў—28 гатункаў на суму 1185 руб. 73 кап., мэханічных частак і машын непатрэбных заводу на суму 7515 руб., 18 электраматораў на суму 2636 руб. 15 пускавых рэастатаў на 1500 руб., 25 рубільнікаў, 13 амперамэтраў пераменнага току і г. д.

Янка.

Т. Маршак—завод «Энергія» член [illegible]

25 лютага ў краінах капіталу

Ня гледзячы на тэрор з боку карнага атраду імпэрыялізму—фашыстаў і паліцыі

стотысячныя калёны магільшчыкаў капіталізму—пралетары капіталістычнага сьвету вышлі на вуліцы дэманстраваць сваю гатоўнасьць да рашаючых баёў з капіталізмам

Бурныя дэманстрацыі беспрацоўных у Нямеччыне

БЭРЛІН, 23-II. 23 лютага ў шмат якіх рабочых цэнтрах зноў адбыліся бурныя сутычкі паміж рэвалюцыйнымі рабочымі і нацыянал - сацыялістамі (фашыстамі), падтрымліваемымі паліцыяй.

У прамысловым цэнтры Саксоніі—Цытаў—рабочыя далі рашкі адпор фашысцкай дэманстрацыі. Адбылася лютая бойка з фашыстамі і паліцыяй. Адзін забіты і шмат параненых, сярод іх два паліцэйскія. Дэманстрацыі 25 лютага забаронены.

У Штутгарце таксама мелі месца сутычкі Адзін фашыст і паліцэйскі паранены.

У Дуізбурзе ўчора адбылася бурная дэманстрацыя рабочых перад будынкам муніцыпалітэту. Адбылася сутычка з паліцыяй. Шмат параненых.

Крывёю рабочых заліты вуліцы Варшавы

Расстрэл рабочай дэманстрацыі фашысцкай ахранкай

ВАРШАВА, 24-II. Учора ў ВАРШАВЕ ў рабочым раёне—ВОЛЯ адбылася дэманстрацыя і лятучы мітынг, на якім выступіў камуністычны дэпутат сойму БУЖЫНСКІ. Арыштавана некалькі ўдзельнікаў дэманстрацыі.

Учора-ж адбылася пад кіраўніцтвам камуністаў шматлюдная дэманстрацыя беспрацоўных у МАРКАХ (пад Варшавай). У гэтай дэманстрацыі прынялі ўдзел і беспрацоўныя, пасланыя на так званыя «грамадзкія работы». Яны кіну лі работу і з лапатамі ў руках далучыліся да беспрацоўных. Супроць дэманстрантаў, разгарнуўшых сьцяг з камуністычнымі лёзунгамі выступілі ўзброеныя вінтоўкамі паліцэйскія. Калі паліцэйскія спрабавалі разагнаць беспрацоўных, апошнія пачалі закідаць паліцыю каменьнямі. У аднаго паліцэйскага беспрацоўныя адабралі вінтоўку. Паліцэйскія далі залп па дэманстрантах. Некалькі чалавек паранена, у тым ліку трое цяжка. Цяжка параненыя перавезены ў шпіталь у Варшаву і знаходзяцца пры сьмерці.

Учора адбыўся сход рабочых на капальні «ФЭРДЫНАНД», у якім удзельнічала 1.500 чалавек. Сход прайшоў надзвычайна бурна. Рабочыя прынялі прапанаваную камуністамі рэзалюцыю і абралі забастовачны камітэт, якому даручана безадкладна падрыхтаваць за бастоўку ў адказ на спробу правесьці звальненьне рабочых. Спрабаваўшым выступіць на сходзе сацыял-фашыстам, рабочыя не далі гаварыць.

* * *

ВАРШАВА, 24-II. Сёньня памёр у шпіталі адзін з параненых ў часе дэманстрацыі ў Марках беспрацоўны. Другому параненаму адрэзалі пастрэленую нагу.

Газэты падкрэсьліваюць выключную актыўнасьць і абуранасьць дэманстрантаў: яны ня спынілі атаку на будынак муніцыпалітэту і паліцыі нават пасьля таго, як паліцэйскія далі залп. Страляўшыя паліцэйскія вымушаны былі пад напорам дэманстрантаў схавацца ў памяшканьне паліцэйскага вучастку. Дэманстрантаў разагнаў выкліканы з Варшавы атрад паліцыі.

Прымусовая праца ў фашысцкай Польшчы

ВАРШАВА, 24-II. «Ілюстраваны Кур'ер Цодзённы» паведамляе падрабязнасьці ўжываньня прымусовай працы ў польскіх астрогах. Газэта заяўляе, што ў астрозе ў Вісьнічы (Усходняя Галіцыя) і ў Гародні маецца цэлы рад прадпрыемстваў. Астрог мае электрастанцыю, млын і лесапільню. Усе гэтыя прадпрыемствы працуюць на рынак з поўнай нагрузкай.

**Міністэрства юстыцыі прызнае, што прадпрыемствы, належныя астрожнаму ведамству, даюць вялікія прыбыткі. Узн

Пастанова 3-га пленуму ЦКК КП(б)

па дакладу тав. КАЛНІНА аб рабоце прэзыдыуму ЦКК за пэрыяд ад 13-га зьезду КП(б)Б і аб пастановах прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б)

I.

Заслухаўшы даклад т. Калніна аб рабоце прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б за час ад XIII зьезду КП(б)Б і пастановах прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б), па выніках праверкі работы ЦКК КП(б)Б, пленум ЦКК цалкам і поўнасьцю ўхваляе пастановы ЦКК УсеКП(б).

Пленум ЦКК прызнае палітычную лінію ў рабоце прэзыдыуму правільнай і ўхваляе праведзеную работу.

Адзначыць, што прэзыдыум ЦКК рашуча ахоўваў ленінскае адзінства КП(б)Б у змаганьні на два фронты, правёў вялікую работу на вытворчасьці і ачышчэньні КП(б)Б ад права-апартуністычных і нацыянал-апартуністычных элемэнтаў, чым спрыяў яшчэ большай мабілізацыі КП(б)Б на барацьбу за правядзеньне генэральнай лініі партыі, супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, «левага» апартунізму, нацыянал-апартунізму, двурушніцтва і прымірэнцтва да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі.

II.

Пленум ЦКК канстатуе, што праведзена ЦКК УсеКП(б) праверка работы органаў КК-РСІ Беларусі аказала істотную дапамогу ў працы ЦКК-НК РСІ. Адзначаючы за апошні час значнае пераключэньне ў рабоце ЦКК КП(б)Б па выпраўленьні недахопаў на аснове пастаноў ЦКК УсеКП(б), пленум завастрае ўвагу прэзыдыуму і ўсіх кантрольных камісій КП(б)Б на неабходнасьці далейшага рашучага выпраўленьня недахопаў і перабудовы работы ЦКК-НК РСІ і КК-РСІ на мясцох, у поўнай адпаведнасьці з пастановамі XVI зьезду партыі і сьнежаньскага пленуму ЦКК УсеКП(б).

Кладучы ў аснову сваёй далейшай работы пастанову ЦКК УсеКП(б), XVI і XIII зьезду партыі, пленум ЦКК лічыць што: «Адзнэй з важнейшых задач ЦКК-РСІ павінна быць выяўленьне і мабілізацыя ўсіх рэсурсаў краіны да далейшага паскарэньня тэмпаў індустрыялізацыі» (з пастаноў XVI зьезду).

Пленум лічыць, што праверка, выкананьня плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі і садзейнасьць у ажыцьцяўленьні высокіх тэмпаў індустрыялізацыі, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як класы на аснове суцэльнай калектывізацыі—павінна займаць асноўнае і рашаючае месца ў рабоце ЦКК-РСІ і яе органах на мясцох.

Пленум даручае прэзыдыуму ЦКК і цэнтральным камісіям забясьпечыць сыстэматычную праверку выкананьня апошняй пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК па пытаньні аб рабоце чыгуначнага і водзнага транспарту, дабіўшыся неадкладнага пералому і мабілізацыі ўвагі партыйных арганізацый, рабочых мас транспарту на хуткае і выразнае ажыцьцяўленьне гэтых пастаноў.

Адзначаючы буйнейшыя недахопы ў пытаньнях якасьці прадукцыі, рацыяналізацыі прамысловасьці і будаўніцтва, пленум ЦКК з ўсёй катэгарычнасьцю завастрае ўвагу кантрольных камісій партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый на задачы палепшаньня якасьці прадукцыі зьніжэньня сабекошту і рацыяналізацыі.

Пленум даручае прэзыдыуму ЦКК і кантрольным камісіям прамысловых раёнаў скацэнтраваць максімум увагі навакол гэтых задач, бічы па ўсякай недаацэнцы і ігнараваньні, як праваапартуністычнай дзейнасьці, увязваючы барацьбу за якасьць і зьніжэньне сабекошту на аснове рацыяналізацыі і ўдыму прадукцыйнасьці працы з барацьбой за поўнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну сваячасова мабілізуючы і папярэджваючы прарывы ў выкананьні плянаў. Арганізаваць сыстэматычную праверку выкананьня пастаноў лістападаўскага пленуму ЦКК КП(б)Б (30 г.) па пытаньнях прамысловасьці з прыцягненьем шырокіх рабочых мас ударнікаў.

Ня гледзячы на значную работу, праведзеную прэзыдыумам ЦКК па правераны становішча будаўніцтва, пленум адзначае, што дырэктывы партыі ў гэтай частцы выконваюцца ўсё яшчэ незадавальняюча. Даручыць прэзыдыуму ЦКК і КК-РСІ узмацніць кантроль на ўсіх вучастках будаўніцтва (прамысловага, сел.-гасп., жыльлёвага, дарожнага), мабілізуючы ўвагу партыйных арганізацый і рабочай масы на барацьбу з нядбайнымі і часам шкодніцкімі адносінамі, да будаўніцтва, з недапушчальнай зацяжкай і па-заплянавым будаўніцтвам, дабіваючыся рашучага зьніжэньня будаўнічага індэксу, палапшэньня якасьці будаўніцтва на падставе яго рацыяналізацыі, узяўшы пад асобы кантроль будаўніцтва ў раёнах, асабліва ў саўгасах і калгасах.

Пленум ЦКК прапануе прэзыдыуму ЦКК і ўсім КК-РСІ забясьпечыць сталы нагляд за няўхільным ажыцьцяўленьнем пастаноў сьнежаньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б па пытаньнях рабочага забесьпячэньня. Зьвярнуць асаблівую ўвагу КК-РСІ на разгортваньне сапраўды масавага рабочага кантролю над працай каапэрацыі і органаў рабочага забесьпячэньня, па рашучым выкараненьні з каапэрацыі «нэпманскага душку», выгнаньні апартуністычных і чужых элемэнтаў, якія тармозяць барацьбу партыі і рабочае клясы за перамаганьне часовых харчовых труднасьцяй.

Рэальныя пляны трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрабуюць максімальнага напружаньня ўсіх сіл партыйных арганізацый і рабочай клясы на пераманаьні труднасьцяй, выніхаючых з абвостранай клясавай барацьбы і шалёнага супраціўленьня кулака-нэпманокіх элемэнтаў нашаму сацыялістычнаму наступленьню. Неабходна рашуча выкарчоўваць рэшткі шкодніцтва на пасобных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, узяўшы адказнасьць ячэек і кіраўнікоў прадпрыемстваў за факты шкодніцтва дабіваючыся рашаючых посьпехаў у справе аўладаньня тэхнікай, узьняцьця вытворчай прапаганды, узмацненьня ўвагі вынаходзтву і рабоце органаў рацыяналізацыі, арганізоўваючы далейшы ўздым і поўнае скарыстаньне ўзрастаючага вытворчага энтузіязму рабочай клясы, які выяўляецца ў сацыспаборніцтве, ударніцтве, сустрэчным прамфінпляне. Пленум прапануе ўзмацніць барацьбу з апартуністычнымі адносінамі да ініцыятывы рабочых мас з усялякімі настроямі зьніжэньня тэмпаў, немагчымасьці выкананьня плянаў з-за «аб'ектыўных» прычын і г. д. Толькі няўхільнае правядзеньне генэральнай лініі партыі забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Канстатуючы значныя посьпехі ў справе ўзмацненьня барацьбы з бюракратызмам, чысткі і арабочаньня савецкага апарату, узмацненьня раённага савецкага апарату ў сувязі з ліквідацыяй округ, пленум ЦКК адзначае, што рад дырэктыў партыі па ўзмацненьні і самарацыяналізацыі апарату, па зьніжэньні адміністрацыйна - кіраўнічых выдаткаў і асабліва па ажыцьцяўленьні масавага рабочага кантролю зьнізу—шэфства заводаў над савецкім апаратам—выконваюцца яшчэ зусім не здавальняюча.

Пленум ЦКК даручае прэзыдыуму і кантрольным камісіям узмацніць работу па барацьбе з бюракратызмам і рацыяналізацыі савецкага апарату, ажыцьцяўляючы дырэктыву XVI зьезду аб «разгорнутым наступленьні на бюракратызм», праводзячы на справе паказаньні т. Леніна аб тым, што: «правяраць людзей і правяраць фактычнае выкананьне справы—у гэтым, яшчэ раз у гэтым, толькі ў гэтым цяпер самае галоўнае ўсёй работы, усёй палітыкі», бязьлітасна б'ючы па момантах безадказнасьці чыноўніцкага самаздавальненьня, нясумленнага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду, што зьяўляецца найбольш небясьпечным і злосным відам бюракратызму.

Пленум даручае прэзыдыуму ЦКК рашуча дабівацца ўкараненьня плянавасьці ў рабоце цэнтральных і раённых устаноў, устанаўленьня выразнага плянаваньня па лініі прамысловасьці, будаўніцтва і сельскай гаспадаркі, вядучы жорсткую барацьбу з усялякай блытанінай, момантамі непрадуманага, галавацяпскага падыходу да складаньня плянаў, што тармозіць своячасовае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі.

У найкарацейшы час зрабіць карэннае палепшэньне сыстэмы кіраўніцтва цэнтральнага апарату раёнамі, паставіўшы ўзорную работу ў раённым і нізавым савецкім апараце. Прыняць усе меры, каб да 1-га жніўня скончыць чыстку савецкага апарату з шырокім прыцягненьнем рабочых мас, скончыць пачатую праверку рэалізацыі вынікаў чысткі сіламі шэфскіх брыгад, рабочых і калгасных мас.

Пленум катэгарычна абавязвае кантрольныя камісіі, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі прыняць неадкладныя меры ў разгортваньні рабочага шэфства над дзяржапаратам, накіроўваючы яго, галоўным чынам, на штодзенны кантроль з боку заводаў-шэфаў па выкананьні падшэфным апаратам важнейшых дырэктыў партыі і ўраду. Настойліва дабівацца ажыцьцяўленьня пастаноў XVI зьезду аб перадачы рабочым заводаў-шэфаў бясплатнага выкананьня асобных функцый дзяржапарату ў парадку грамадзкай нагрузкі пасьля сканчэньня працы на вытворчасьці. Пленум указвае ўсім партыйным і прафэсыянальным арганізацыям, што недаацэнка рабочага шэфства над дзяржапаратам, зьяўляецца праяўленьнем правага апартунізму ў практычнай дзейнасьці.

Даручыць прэзыдыуму ЦКК і кантрольным камісіям павесьці жорсткую барацьбу з канкрэтнымі фактамі недаацэнкі і ігнараваньня рабочага шэфства, дабіўшыся карэннага пералому, правёўшы на працягу сакавіка м-ца, сумеона з прафсаюзамі, месячнік наладжаньня шэфскай работы над дзяржапаратам.

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне ўсіх задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрабуе ад ЦКК і яе органаў праводзіць далей непрымірымую барацьбу за ўмацаваньне ленінскага адзінства КП(б)Б на аснове правядзеньня генэральнай лініі партыі і яшчэ больш рашучай мабілізацыі КП(б)Б на барацьбу з апартунізмам, асабліва з правым, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з усялякімі антыпартыйнымі групоўкамі, двурушніцтвам і прымірэнцтвам да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі.

Даручыць прэзыдыуму і кантрольным камісіям КП(б)Б праводзіць далей шае ачышчэньне КП(б)Б ад апартуністычных элемэнтаў—правых і нацыянал-апартуністаў. Забясьпечыць сваёй праверкай няўхільнае правядзеньне нац. палітыкі партыі і змаганьне з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, контр-рэвалюцыйным нац-дэмакратызмам і шавінізмамі розных колераў, узмацняючы інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўных мас.

Неадвальняючае разгортваньне самакрытыкі ў радзе партыйных арганізацый, наўпасьць фактаў окажэньня і заціску самакрытыкі (Барысаў, Віцебск, Чарэя), вынікі рабселькорайўскага рэйду па рэгаваньні на заметкі і рад рабселькораўскіх спраў настойліва патрабуюць узмацненьня ўвагі ў справе разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі і барацьбы з элемэнтамі заціску і скажэньня яе. Неабходна дабівацца ўзмацненьня партыйнага кіраўніцтва і ўздыму арганізуючай ролі ячэек і партыйных камітэтаў справай разгортваньня самакрытыкі, накіроўваючы яе ў абарону генэральнай лініі партыі, б'ючы па ўсялякіх спробах скарыстаньня самакрытыкі апартуністычнымі і варожымі элемэнтамі супроць партыі і дыктатуры пралетарыяту і па ўсялякіх момантах перахлістваньня.

Пленум даручае прэзыдыуму ЦКК і кантрольным камісіям дабіцца ў найкарацейшы час карэннага пералому ў разгортваньні масавай работы і ў пастаноўцы сыстэматычнай масавай праверкі выкананьня, скарыстаўшы правядзімую зараз праверку масавай работы для ўзьнімацця ролі КК-РСІ, як арганізатара мас па іх мабілізацыі на правядзеньне генэральнай лініі партыі.

Адзначаючы, што неадназовыя дырэктывы ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб подборы і ўзмацненьні кадраў ЦКК-РСІ выконваюцца яўна неадвальняюча пленум даручае прэзыдыуму, у сувязі з надыходзячымі перавыбарамі гар. і райКК-РСІ, неадкладна заняцца падборам і ўзмацненьнем кадраў КК-РСІ як мясцовых КК-РСІ, так і апарату ЦКК-НК РСІ, аб чым паставіць пытаньне перад ЦК КП(б)Б.

Пленум асобна зварачае ўвагу прэзыдыуму ЦКК на выкананьне пастановы ЦКК УсеКП(б) у частцы зьняцьця скампрамэтаваўшых і неапраўдаўшых сябе работнікаў на адказных пасадах, даручае ўсім кантрольным камісіям рашуча дабівацца поўнай рэалізацыі гэтай пастановы.

Даручыць прэзыдыуму ЦКК уключыць у плян працы ЦКК НК РСІ на 1931 г. пастановы прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) па абсьледваньні, забясьпечыўшы поўнае выкананьне пастаноў ЦКК УсеКП(б).

Старшыня ЦКК КП(б)Б КАЛНІН.

Усім Гаркомам і Райкомам КП(б)Б

Ход загатоўкі і адгрузкі мэталёму мэталюргічным заводам зусім нездавальняючы. Студзеньскі плян па БССР выкананы толькі на 59 проц. ЦК КП(б)Б прапануе прыняць тэрміновыя захады да ліквідацыі студзеньскага прарыву і выкананьня квартальнага пляну загатовак дзесяці тысяч васьмісот дзесяці тон мэталёму, праверце работу загатоўчых органаў мабілізуйце грамадзкасьць для стопроцантнага выкананьня пляну, які забясьпечыць нармальную работу мэталюргічнай прамысловасьці.

Сакратар ЦК КП(б)Б Шаранговіч.

Будуем дрыжаблі „Праўда" і „Клім Варашылаў"

Вучнёўскі і настаўніцкі калектывы Самахвалавіцкай ШКМ на пабудову дырыжабля „Праўда" сабралі 105 руб.

На пазыку «пяцігодка ў чатыры гады» дадаткова падпісаліся ўсе настаўнікі, давёўшы падпіску на 100 проц. да атрымоўваемай месячнай пэнсіі.

Сярод працоўнага насельніцтва акалічных школу вёсак калектывам Самахвалавіцкай ШМК сабрана 1236 р.

Бабкоўскі.

* * *

Асьветнікі Ельскага р. уносяць аднадзённы заробак ў фонд дырыжаблябудаўніцтва і выклікаюць пасьледваць іх прыкладу ўсіх асьветнікаў БССР.

Стрыбульскі.

* * *

6 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вёскі Сялянка, Бярэзінскага раёну, ўносяць на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў»—28 руб. 42 коп.

А. Кравят.

ПАПРАЎКА

У пастанове СНК аб палепшаньні практыкі крэдытнай рэформы, зьмешчанай у «Савецкай Беларусі» № 44, на 4 стар., у 6-м пункце замест «базарах» трэба чытаць «базах».

БІЦЦА за ПОУНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ і ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ЛЁНАЗАГАТОВАК

2½ тоны лёну валяецца ў гумне

Пытаньню лёназагатовак надаецца зараз шмат увагі, як найважнейшай кампаніі па забесьпячэньні прамысловасьці сыравінай.

Аднак, Чэрыкаўскі райкалгассаюз пры правядзеньні гэтай кампаніі абмежаваўся толькі апульнымі словамі, агульнымі паказаньнямі; практычнайжа дапамогі калгасам ня даў.

Згодна паказаньняў Белкалгасцэнтру, праўленьні райкалгассаюзаў павінны былі арганізаваць дапамогу калгасам па апрацоўцы лёну, асабліва там, дзе не хапае рабочай сілы. На жаль у Чэрыкаўскім раёне гэтага ня зроблена.

У калгасе «Чырвонае Сормава» каля 150 пудоў лёну звалена ў гумно і ляжыць неапрацаваным; тое-ж самае і з каноплямі. Праўленьне калгасу лічыць, што «апрацаваць лён яшчэ пасьпеем; перш памалоцім збожжа, а потым возьмемся за апрацоўку лёну.

Як-жа глядзіць райкалгассаюз на гэтую нядбайнасьць? Райкалгассаюз зусім ня хоча практычна дапамагчы калгасу, каб арганізаваць ударную брыгаду з калгасьнікаў і прывесьці ў належны парадак каштоўную сыравіну.

Раённая чацьвёрка па загатоўках добра ведае пра гэта, але таксама не рагае на бязьдзейнасьць ня толькі праўленьня калгасу, але і райкалгассаюзу, які непасрэдна павінен уязьца за выкананьне плянаў загатовак лёну ў калгасах.

Такой безадказнасьці пара ўжо паклаасьці канец. Трэба прымусіць райкалгассаюз практычна дапамагчы калгасу апрацаваць лён і каноплі.

Прамысловасьць павінна быць забясьпечана сыравінай.

П.

Аб загатоўках ня клапоцяцца

Двухдэкадны штурм загатовак лёну зусім ня турбуе загатоўчыя арганізацыі Насовіцкага сельсавету, Гомельскага р-ну. Ня гледзячы на тое, што з боку райкалгассаюзу, райкому КП(б)Б і РВК маюцца адпаведныя дырэктывы, сельсавет на гэта не зьвяртае ніякай увагі.

Камсамольскія ячэйкі таксама атрымалі паказаньне з боку райкому ЛКСМ, аб дапамозе ў стваранні рашучага пералому і ліквідацыі прарыву ў лёназагатоўках, але яны лічаць дзіўным гэтым займацца.

А. Гершман.

Спэкулянты арудуюць

Лёназагатоўкі па Старасельскім сельсавеце выкананы на 50 проц. Цьвёрдыя заданьні кулакамі выкананы на 45 проц. Такія тэмпы загатовак нельга прызнаць здавальняючымі.

Пад бокам сельсавету сяляне прадаюць лён спэкулянтам і сельсавет супроць гэтага ня прымае ніякіх захадаў.

А. Генін.

Прыватнік скупляе лён, а загатоўцы сядзяць у габінэтах

Лёназагатоўкі па Заслаўскім раёне выкананы на 22 проц. пляну; кулацкія гаспадаркі выканалі цьвёрдыя заданьні на 37 проц.

Такая маруднасьць у загатоўках лёну тлумачыцца тым, што раённыя і мясцовыя арганізацыі праўляючы правы апартунізм на практыцы, дапусьцілі патураньне кулацка-заможным гаспадаркам, і не праводзілі выразнай клясавай лініі ў загатоўках, не зрабілі належнага націску на кулака з тым, каб спагнаць з яго цьвёрдыя заданьні ў тэрмін.

Загатоўчыя арганізацыі недастаткова ўдзельнічалі ў справе загатовак, апарат ня быў мабілізаваны, ня было належнага націску на кулацка-заможную частку вёскі.

Лён-жа ў раёне ёсьць, бо сяляне прывозяць яго ў Заслаўль на рынак і прадаюць прыватніку. Загатоўчыя-ж арганізацыі спадзяюцца на самацёк і чакаюць, пакуль ім лён прывязуць на склады.

У сувязі з абвяшчэньнем двухдэкадніка штурму лёназагатовак для ліквідацыі прарыву па лёназагатоўках, рай камсамол і райпрафсавет вылучылі адзінаццаць брыгад з 33-х асоб, якія пасланы ў сельсаветы для ўзмацненьня загатовак лёну.

Пры актыўным удзеле камсамолу і прафсаюзаў, якія адгукнуліся на заклік ураду і пашлі на дапамогу ліквідацыі прарыву, лёназагатоўкі будуць выкананы поўнасьцю.

Неабходна, каб РВК і сельсаветы безадкладна спагналі з кулацка-заможных гаспадарак цьвёрдыя заданьні на ільну.

Свой.

0,7 проц.—ганебная пляма

Талачынцы, ударніцтвам і сацспаборніцтвам дакажэце, што вы можаце штурмаваць на 100 проц.!

Лёназагатоўчыя арганізацыі ў Талачынскім раёне працуюць на самацёк. Райкапсаюз ня ведае, колькі і ён закантрактавана лёнавалакна. Работнікі Высока-Гарадзецкага і Смалянскага сельсавету зусім нічога ня робяць па загатоўках лёну. У іх заданьне выканана толькі на 0,7 проц. Заможнікаў і кулакоў яны не чапаюць, кажучы: скавошта іх турбаваць, калі іх і так савецкая ўлада пакрыўдзіла».

Так было ўвесь час, пакуль не пачаўся двухдэкадзік штурму лёназагатовак, які адразу зварушыў работу з месца. Праведзена нарада раённага актыву; увесь актыў абвясьціў сябе ўдарным і выклікаў на сацспаборніцтва Аршанскі раён і райпыканком на 100 процантнае выкананьне лёназагатовак. Усе члены РК, КК-РСІ і РВК разьехаліся па вёсках для правядзеньня двухдэкадніка штурму лёназагатовак.

Ударная работа і сацспаборніцтва павінны даць поўнае выкананьне пляну лёназагатовак.

Шаршун.

Папярэдзіць перагібы

У цэлым радзе сельсаветаў, Вуяскага раёну, назіраюцца такія зьнішчэньні цьвёрдыя заданьні па лёназагатоўках даводзяцца да адных гаспадарак, на мясазагатоўках—да другіх, па збожжы—да трэціх, у тым ліку і да сераднякоў.

Такім чынам, скрыўляецца клясавая лінія; за кошт кулака абкладаюць серадняка, пры недаабкладаньні сапраўдных заможнікаў і кулакоў.

Зараз з боку РВК ужываюцца меры да выпраўленьня скажэньняў клясавай лініі.

А. М—ні.

Далей марудзіць нельга

Калгас «Чырвоны Партызан», Каралінскага раёну, да гэтага часу яшчэ ня здаў ніводнага кілё лёнавалакна па кантрактацыі, не зважаючы на тое, што некалькі разоў яму рабілася напамінаньне.

Марудзіць далей нельга, патрэбна здаць лён.

Нат.

З лістоў рабселькораў

У Крукавіцкім сельсавеце, Азарыцкага раёну, плян веснавой сяўбы не даведзены да гаспадарак, ачыстка насеньня прадзідзь марудна. Пастановы сходу аб веснавой сяўбе застаюцца на паперы. Па лініі КСУ няма ніякай падрыхтоўкі да вясны. Сельсавет бязьдзейнічае.

Кудрявы.

Калгас «Леніна», Койданаўскага р-ну, да веснавой сяўбы падрыхтаваны: насеньне ачышчана, сельска-гаспадарчы інвэнтар рамонтуецца, вытворчыя пляны абмеркаваны.

В. Пыж.

Межанскі раён сваячасова пачаў падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны і дзейна рыхтуецца да сяўбы. Калгас «Победа» высунуў сустрэчны плян сяўбы.

17 проц. ўсёй плошчы Межанскага раёну будзе засеяна лёнам, бо пры спецыялізацыі раёнаў яму нададзены лёнаводнамалочны напрамак.

Ш.

Індывідуальны сэктар Хойніцкага раёну слаба рыхтуецца да сяўбы. У вв. Рудакоў, Варапец, Губаравічы, Зьвяніцкае і Высоцкае—ачыстка зерня не праводзіцца. Сельсавет ня склаў яшчэ пляну сяўбы. Пытаньне падрыхтоўкі да сяўбы не абгаворвалася на агульных сходах.

А. Гарун.

Пасеўныя пляны не даведзены да вёсак Рудзенскага сельсавету, Сьмілавіцкага раёну; сходаў па пытаньні пасеўкампаніі ня было. Па вёсках і калгасах не разгорнута ачыстка насеньня і рамонт сельска-гаспадачага інвэнтару. Камсамольскія і партыйная ячэйкі не дапамагаюць у падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны.

Ул. Высоцкі.

Саўгас Чачэвічы не прапрацаваў пляну сяўбы на вытворчай нарадзе і агульным сходзе рабочых. Слаба рамонтуецца с.-г. інвэнтар. З 8-мі трактароў, наяўных на Магілёўскі завод «Адраджэньне», адрамантавана толькі 2. Збруя і транспарт патрабуюць вялікай папраўкі. Збор попелу не арганізаваны Зерначышчальны абоз не працуе, ня гледзячы на тое, што саўгас мае 2 машыны і штодаводле заданьня, павінен ачысьціць 100 тон насеньня сялянам. Не хапае насеньня лубіну, бульбы, аўсу і сэрадэлі і невядома адкуль яно будзе здабыта. Не падлічана колькасьць патрэбнай цягавай сілы.

У саўгасе не хапае 15 трактарыстаў, але ніхто не клапоціцца аб гэтым. А спецыялісты па трактарнай справе ў саўгасе ёсьць, і трактарыстаў можна было падрыхтаваць на месцы.

Ціхі.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

«Культпроп Менгаркому КП(б)Б катэгарычна прапануе т. т. Шэйнэру, Карачуну, Плашчанскай, Леоненка, Бэру, Маркаву, Аўруціну, Рубіну, Паўлоўскаму, Рагазінкавай, Елешкевічу, Хэйману, Стругаву, Лушчынскаму, Кабакову, Шлямбергу, Фрыдману, Парфенюку, Палеесу, і Гольдшварцу не позьней 27-га лютага прадставіць матар'ял абгляду насьценных газэт і шматтыражак.

У выпадку непрадстаўленьня, справа будзе перадана Гар. КК.

Загадчык Культпропу Менгаркому КП(б)Б Кулінёнка.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО

Беларускі Другі дзярж. тэатр — 25 лютага паказ для саюзу сувязі „РЭЙКІ ГУДУЦЬ" п'еса ў 5 дзеях, 9 абразох. Пачатак а 8 гадз.

З ПАНЯДЗЕЛКА 23-га ЛЮТАГА

„Чырвоная Зорка" — Новы мастацкі фільм АПОШНІ БЭК. Хроніка Саюзкіно № 3. Звыш праграмы гукавы фільм. Пачатак а 7, 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса а 5 гадзіне.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — 2-і тыдзень савецкі фільм вытворчасьці „Прэцкіно" ЖАНЧЫНА Ў ЛЕСЕ. Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. Каса ад 4 гадз. 30 хв.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" — Новы мастацкі фільм ВАЙНА—ВАЙНЕ. ЗВЫШ ПРОГРАМЫ „Брацішкі спаборнічаюць". Пачатак 1-га сэансу а 6 з пал. гадз. Каса ад 4 гадз.

Дзіцячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР" — Эпізод барацьбы з басмач ствам ШАКАЛЫ РАВАТА кіно-п'еса ў 9 частках. Пачатак сэансаў з 1 гадз. дню. Каса а 12 гадз. дню.

Сёньня 26 II г.г. у анатомічным корпусе Мэдычнага Інстытуту (Унівэрсытэцкі гарадок) а 7 гадз. увечары

ПРАЦЯГ СПРЭЧАК

па агляду дзейнасьці катэдры антропалёгіі БАН і заключнае слова дакладчыкаў і камісіі па праверцы і чыстцы апарату БАН.

КАМІСІЯ.

Беларуская Акадэмія Навук

— АБВЯШЧАЕ —

ПРЫЕМ АСЬПІРАНТАЎ

па наступных дысцыплінах

1) Для яўрэйскага сэктару — па гісторыі, эканоміі, літаратуразнаўства, мовазнаўства.

2) Для польскага сэктару — гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Польшчы, культуры і быту польскага насельніцтва ў БССР, польскай мове і літаратуры.

3) Для літоўскай катэдры — гісторыі.

Курс асьпірантуры працягваецца 3 гады. Жадаючыя паступіць павінны мець вышэйшую асьвету і апрача гэтага павінны ведаць адпаведныя нацыянальныя мовы.

Члены партыі і рабочыя, якія ня маюць закончанай вышэйшай асьветы, могуць быць прыняты, калі маюць адпаведную тэарэтычную падрыхтоўку і стаж грамадзкай работы.

Стыпэндыя—200 руб.

Да заявы трэба прылажыць наступныя дакументы: 1) аўтабіяграфію, 2) даведку ад грамадзкіх арганізацый, 3) арыгіналы або копіі дакумэнтаў аб сканчэньні ВНУ.

Заявы накіроўваць па адрэсе:

БССР, Менск, рог Ленінскай і Унівэрсытэцкай, № 29—35, Беларуская Акадэмія Навук.

На пэдфаку Б. Д. У. з 1-га красавіка г. г.

АДКРЫВАЕЦЦА ПОЛЬСЭКЦЫЯ

пры аддзяленьнях: прыродазнаўчым, літ.-лінгв., пэдалёга-пэдагагічным і паліт.-асьветным.

На польсэкцыю прымаюцца рабочыя, сяляне і служачыя, якія маюць сярэднюю асьвету і ведаюць польмову.

— Прыём заяў—да 20 сакавіка. —

Заявы пасылаць па адрасе: гор. Менск, БДУ, дэканат пэдфаку, польсэкцыя.

МАГІЛЕЎСКІ БУДАЎНІЧЫ ТЭХНІКУМ

абвяшчае

ВЯСЕНЬНІ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ на 1 курс на німэйпамянёныя архітэктурныя аддзяленьні:

1. Агро-індустрыяльнае аддз. будзе прынята 30 асоб
2. Фабрычна-заводзкае „ „ „ 30 асоб
3. Жыльлёвае аддз. „ „ „ 30 асоб

У тэхнікум прымаюцца асобы скончыўшыя 7 годку. Узрост паступаючага ад 16 да 25 гадоў (для рабочых да 30 гадоў). 70 проц. раб., 15 проц. сялян калг. 15 проц. служ. па сац. становішчу будзе прынята.

Прыём заяў ад асоб жадаючых паступіць—да 20 сакавіка г. г. З 20 да 25 сакавіка—залічэньне ў тэхнікум.

Да заявы неабходна дадаць наступныя дакументы: Аб адукацыі, узросце праве голасу, здароўі, сацыяльным становішчы і заверэную анкету, 2 фатаграфічныя карткі і на 25 кап. паштовых марак для адказу аб залічэньні.

Тэхнікум забясьпечвае студэнтаў 65 проц. стыпэндыяй у разьмеры 36—54 руб у месяц.

Заняткі ў тэхнікуме пачнуцца 5 красавіка г. г., аб чым кожны залічаны студэнт атрымае вызаў на заняткі.

Дырэктар тэхнікуму ЛІПСКІ.

Беларускае Аддзяленьне Саюзскур

даводзіць да ведама усіх, што на падставе пастановы ЭКАНА БССР ад 9 кастрычніка 1930 г.

ЦАЛКАМ ЗАБАРОНЕНА ПЕРААПРАЦОЎКА

усіх відаў скурсыравіны на тэрыторыі БССР усім прыватным асобам, калгасам і савгасам як для уласных патрэб, так і у парадку давальчэства.

Пераапрацоўка аўчыны па лініі сампранкаапэрацыі дазваляецца спэцыяльным арцелям па сьпісу, зацьверджанаму НКГандлем БССР.

Усім дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям, у тым ліку—каўбасным арцелям, савгасам і калгасам (з абагуленай жывёлай) забараняецца ашпарваць і асмальваць сьвіныя тушы. Перапічаныя арганізацыі абавязаны зьнімаць скуры з забізаемых сьвіней (за выключэньнем бэкона), а таксама забараняецца падворны забой сьвіней у гарадох і населішчах, дзе маюцца рэзьніцы альбо забойныя пункты.

Беларускае аддзяленьне Саюзскур.

Пры пэдфаку БДУ адкрываецца

ВЯЧЭРНІ ПЭДФАК

з двума аддзяленьнямі: сацыяльна гістарычным і фізыка-тэхнічным.

На ніжнае аддзяленьне прымаецца 30 асоб.

Тэрмін навучаньня на сац.-гіст. аддзяленьні—3 гады, а па фіз.-тэхнічным—3 з пал. гады. Працяг навучальнага году 10 месяцаў. Заняткі будуць праходзіць штодзённа, выключаючы выхадных дзён, па 5 акадэмічных гадзін (з 6 да 10 г. вечара).

Прыём заяў—да 20 сакавіка г. г.

Заявы прымаюцца ў канцэлярыі пэдфаку (Унівэрс. Гарадок, прыродазнаўчы корпус) штодзённа, за выключэньнем 5, 10, 15, 20, 25 числа з 12 да 3 гадз.

Умовы прыёму тыя-ж, што і на дзенны пэдфак.

Заняткі на вячэрнім пэдфаку пачнуцца 1 красавіка.

Дэкан пэдфаку Рудніцкі.

На першы курс Рагачэўскага Белпэдтэхнікуму

АДКРЫТ ВЯСЕНЬНІ НАБОР.

Заявы з прылажэньнем дакумэнтаў, згодна даведніку для паступаючых у пэдтэхнікум на 1930-31 навучальны год прымаюцца з 15-II па 20-II. Заняткі пачынаюцца з 1 красавіка.

Адначасова пры пэдтэхнікуме адчыняюцца з 1 сакавіка на 100 асоб кароткатэрміновыя курсы для падрыхтоўкі пастаўнікаў.

Пэдтэхнікум.

ФАТАГРАФІЯ БЕЛДЗЯРЖКІНО

для дэлегатаў X Усебеларускага зьезду саветаў робіць фото-здымкі бяз усякай чаргі, СА СКІДКАЙ 50% з устаноўленага тарыфу

Адрас фатаграфіі: САВЕЦКАЯ 81.

Адчынена штодзённа з 10 гадз. раніцы да 6 гадз. увечары

Гомельскі агра-пэдінстытут паведамляе, што

ЗАЯВЫ НА ВЯСНОВЫ НАБОР

прымаюцца на фізыка-тэхнічнае і хэміка-біолёгічнае аддз. ДА 10 САКАВІКА Г. Г.

Пададзеныя заявы на зімовы прыём будуць разглядацца. Заняткі пачнуцца 1 красавіка.

Дырэктар інстытуту ЕРМАКОЎ.

Нарсуд 1 вуч. гор. Менску, на падставе прыгавару суду ад 5 лютага 31 г. па 241 арт. КК, за пакражу рэчаў са сталоўкі № 22, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Андрыеевіч Надзі Іванаваі.

Нарсуд 1 вуч. гор. Менску, на падставе прыгавару суду ад 31 студзеня 1931 г. па 250б арт. КК, за падзелку талёнаў на атрыманьне абутку абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Галубовічу Адаму Іванаву.

Нарсуд Ляднянскага раёну сваім прысудам ад 6 лютага г.г. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні Бяёўскага сельсавету Грышчынкаву Трахіму Хведараву па 213 арт. Кр. Код. за слабую работу ў справе выкананьня ўсіх відаў загатовак.

Нарсуд Талачынскага раёну, згодна прыгавору ад 6 сьнежня 1930 г. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне дарожнаму майстру ст. Колысь Канчараву Васілю Фядосаву за халатныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Талачынскага раёну, згодна прыгавору, ад 6 лістапада 1930 г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне намесьніку старшыні пажарнай дружыны В. Гірымшчына, Друцкага сель